№ 31 (485) 25 жніўня 2006

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

Аляксандар Шалайка: «Адсядзелі за праўду».
Эніра Браніцкая: «Судзьдзя зрабіў усё, што мог».
Старонка 4.

# Клімат не спрыяе загару



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Аляксандар Шалайка, Эніра Браніцкая (на заднім пляне) у момант выхаду з Валадаркі.**

### У Бабруйск!

Перад «Дажынкамі». Рэпартаж Сяргея Харэўскага. **Старонка 10.**

### КХП БНФ і Партыя БНФ аб'яднаюцца?

У артыкуле «Яднацца трэба са сваімі» Зянон Пазьняк недвухсэнсоўна намякнуў, што ён ня супраць аб'яднаньня двух крылаў былога Народнага Фронту. **Старонка 6.**

### Сокалаў-Воюш шукае перакладніка з румынскае

Гутарка з мэтрам аўтарскай песьні пасьля шумнага посьпеху яго менскіх канцэртаў. **Старонка 26.**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# у нумары


## люстра дзён

Клімат не спрыяе загару ... 4

Аляксандар Шалайка: «Я яшчэ не паведаміў усіх дэталяў працэсу» ... 4

КХП БНФ і Партыя БНФ аб’яднаюцца? ... 6

Невядомыя ў цывільным зладзілі кастынг у салдаты ... 6

Зь «Беларусьсю» пакончана ... 6

Беларускамоўнае навучаньне ў лічбах ... 7

## аб усім патроху

На Чаркізаўскім загінула й беларуска ... 8

Пад Сьветлагорскам знайшлі горад Казімер ... 8

Падсуднаму беларусу ў Маскве ня могуць знайсьці перакладчыка ... 8

Беларусы ўзялі ўдвая болей крэдытаў ... 8

На ўкраінскай заставе гналіся за беларусамі ... 8

Ці ўратуе «Шымана» рэпутацыю Мотавэля? ... 8

У Празе адкрылі Беларускі клюб ... 8

Падатак на капусту ... 8

Менскія аўтобусы пафарбуюць у зялёны колер ... 8

У Клецку паўстане новы касьцёл ... 8

Наша збожжа ў агні не гарыць і ў вадзе ня тоне ... 8

Глеб хацеў паўтарыць подзьвіг Зыдана ... 8

Хроніка ... 14

## рэпартаж

У Бабруйск! ... 10

## меркаваньні

Сяргей Богдан. Гэтым пераможам ... 12

Ігар Бараноўскі. Яшчэ пра Расію, марыянаў, грэка-каталікоў і кроў ... 20

## камэнтары

Павал Севярынец. Калі беларусы сыходзяць у лес ... 14

Аляксандар Класкоўскі. Лапцем па балоце ... 16

## культура

Сокалаў-Воюш шукае перакладніка з румынскае ... 26

## гісторыя

Таямніца «залатога запасу» БНП ... 21

Каляндар верасьня ... 21

Руслан Равяка. Прагрэс — зьнішчальнік гісторыі ... 22

Архівісты вераць у грамадзянскую адказнасьць 22

Алег Дзярновіч. Смак бяседы ... 24

## левым вокам

Як гандляваць людзьмі па-патрыятычнаму. Фэльетон Лёліка Ушкіна ... 17

## калі б...

Малюнкі Лёліка Ушкіна ... 47

## вольны час

Варта паглядзець ... 28

Скахографы ідуць ... 28

Рок за Свабоду ... 29

Небалючае разьвітаньне ... 29


# Галоўны урок Плошчы

## АНДРЭЙ БАРАНАЎ

*«Нацыянальны камітэт аб’яднаных дэмакратычных сілаў разгледзеў пытаньне аб дзейнасьці на наступны год. Да канца жніўня сябры Нацкаму пададуць пляны па сваіх напрамках дзейнасьці. У верасьні будзе зацьверджаны агульны плян працы Нацыянальнага камітэту. Сябры Нацкаму адзначылі, што прыйшоў час «удакладніць сфэры дзейнасьці Нацкаму і ўзмацніць ягоную легітымнасьць». Таксама ў сувязі зь мясцовымі выбарамі неабходна «пазытыўнае пасланьне, якое адкажа на пытаньне «Што рабіць?» у рэгіёнах».*

«Тут дубак, як сярод зімы,
Міхалыч, зьезьдзі па каву!»
Яны верылі ў нас, бо мы
Стаялі да іх ТВАРАМІ.

Рэспэктабэльныя і бэйбусы,
Мужыкі і бабулькі жвавыя
Несьлі швэдры, лекі і тэрмасы,
Бо мы сталі да іх ТВАРАМІ.

Раніцою, як далягляд,
Разглядалі ліхтары сінія
Ды ня вытрымалі б і дня,
Калі б сталі да іх СЬПІНАМІ.

Дык чаму камітэты й калегіі
Зноў гуляюць у гулі, як малыя?
Колькі можна трындзець пра «стратэгію»?
Да землякоў — станьце ТВАРАМІ.

**Андрэй Баранаў** — абаронца намётавага мястэчка, вязень Акрэсьціна ў сакавіку. Аўтар дзёньніка «3 дні, 3,5 ночы і 10 сутак, альбо Як я стаў аптымістам», надрукаванага ў часопісе «ARCHE», 2006, №5.

# Шрэк — гэта Аржамень



У сераду адбылася прэзэнтацыя мультфільму «Шрэк-2», дубляванага па-беларуску. Фільм прасякнуты алюзіямі на беларускую рэчаіснасьць і гісторыю. Правобразам Чароўнага прынца ў беларускай вэрсіі стаўся кароль Рэчы Паспалітай Генрых Валюа. Знайшоўся беларускі адпаведнік нават кельцкаму герою Шрэку — гэта міталягічны пэрсанаж Аржамень, таўстун зь зялёнымі валасамі і добрым характарам, які жыве на балоце. Рэжысэр Сяргей Патаранскі заўважыў, што было б добра, каб як мага болей людзей былі падобныя да Шрэка. «Шрэк-2» будзе распаўсюджвацца праз Інтэрнэт. Каштаваць DVD-мультфільм будзе 8—9 тыс. рублёў.







У свой час

Эдвард Вайніловіч

Магдалена Радзівіл

Васіль Быкаў

# ахвяравалі на «Нашу Ніву»




з пачатку 2006 году
газэта атрымала
6000 ахвяраваньняў
з усіх куткоў Беларусі.
Дзякуй!

# Клімат

**Шалайка** лічыць, што «адсядзелі за праўду». **Браніцкая**: «Судзьдзя намагаўся бесстароньне разгледзець справу».

У панядзелак 21 жніўня на волю выйшлі Эніра Браніцкая і Аляксандар Шалайка. За ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі яны былі асуджаныя на шэсьць месяцаў зьняволеньня. Мікола Астрэйка і Цімох Дранчук атрымалі два і адзін год зьняволеньня адпаведна. На волі Аляксандра і Эніру з кветкамі сустракалі родныя і сябры.

Тых, хто прыйшоў павітаць вызваленьне партнэраўцаў, на Валадарскага, 2 сустракаў ахоўнік з ратвэйлерам. Рэдзенькі ланцужок ахоўнікаў без сабакаў стаяў і ўздоўж вуліцы — побач з уваходам асуджаныя рамантавалі цеплатрасу. Сярод журналістаў былі пераважна газэтчыкі, не было ніводнай здымачнай групы. І хоць ня ўсе верылі, што вызваленьне адбудзецца безь сюрпрызаў, на пачатку 12-й гадзіны, трошкі нечакана, на вуліцу выйшлі Аляксандар і Эніра. Да іх тут жа кінуліся родныя. Павітаўшыся з усімі і прыняўшы віншаваньні, вызваленыя адказалі на пытаньні журналістаў. Шалайка выглядаў няблага, хіба быў заўважна бледны. «Мясцовы клімат не спрыяе загару», — стрымана ўсьміхаўся Аляксандар, які апошнія два тыдні адбыў у камэры ў падвальным памяшканьні. На пытаньні адказваў разважліва і без хваляваньня.

Паўгоду ў няволі для яго, зь ягоных словаў, праляцелі хутка. Па першым часе ў сьледчым ізалятары КДБ затрыманым даводзілі, што на іх усе забыліся. Лісты ад сваіх давялі адваротнае. Былы палітвязень зьбіраецца працягваць грамадзкую дзейнасьць.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Аляксандар Шалайка: «Я яшчэ

На наступны пасьля вызваленьня дзень Аляксандар Шалайка з жонкай і дзіцем зьехалі ў Лагойск да жончыных бацькоў. Там Аляксандра і засьпеў тэлефонны званок карэспандэнта «НН». Нягледзячы на стому, А. Шалайка пагадзіўся адказаць на пытаньні газэты.

**«Наша Ніва»: Аляксандар, усе чакалі ад суду над Вамі найгоршых вынікаў. Прысуд вам быў успрыняты як мяккі. Закрытасьць працэсу не дазваляла зразумець, што стала прычынай гэтага. Чаму ўсё ж улады ўрэшце вынесьлі Вам з Браніцкай досыць мяккі вырак?**

**Аляксандар Шалайка:** Цяжка даць здаровае тлумачэньне ўсяму, што робіцца ў нашай краіне, наш прысуд з таго самага сьпісу. У нармальнай краіне нас увогуле мусілі апраўдаць, бо на судзе не было прад’яўлена ніводнага прамога доказу віны. Аднак калі мы ўжо адседзелі за кратамі пяць з паловай месяцаў, то апраўдаць нас суд ня мог ні ў якім выпадку. Чаму больш далі Астрэйку і Дранчуку? Я думаю, што абсалютна ўсім падсудным абвесьціць мяккі прысуд не маглі, таму Цімоха і Міколу пакаралі больш жорстка.

**«НН»: Праходзіла інфармацыя, што на судзе Вы прызналі частку віны. Віну ў чым менавіта Вы прызналі?**

**АШ:** Гэта няпраўда. Я быў адзіным, хто не прызнаваў сваёй віны ад затрыманьня да вызваленьня. Цімох часткова прызнаў віну на папярэднім сьледзтве, але адмовіўся зрабіць гэта на судзе. Браніцкая і Астрэйка ж прызналі сябе часткова вінаватымі на судзе, што тычыцца ўдзелу ў незарэгістраванай арганізацыі.

**«НН»: Чаму Вы не абскарджвалі вырак суду, калі лічыце сябе невінаватым?**

**АШ:** Я чакаў больш суровага выраку, таму быў нават задаволены такім мяккім прысудам. Спрабаваць даказаць сваю невінаватасьць у нашай краіне почасту немагчыма.

**«НН»: Якімі былі ўмовы ўтрыманьня ў турмах?**

**АШ:** Калі ў сьледчым ізалятары КДБ пры пэўных умовах можна застацца здаровым, то зрабіць гэта на Валадарцы, мне падаецца, амаль не магчыма. Калі б давялося там праседзець крыху болей, то ня выключана, даведаўся б, што такое тубэркулёз ці нешта іншае. Беларускія турмы знаходзяцца ў жахлівым стане. Даводзілася спаць па чарзе, бо ня ўсім хапала месца на нарах. Са мной у камэ-

# не спрыяе загару



Мужа сустракала цяжарная жонка Вера — у кастрычніку ў Шалайкаў мусіць нарадзіцца другі сын.

Эніра Браніцкая заўважна хвалявалася. Яна ўвесь час усьміхалася і выцірала сяброўкам сьлёзы радасьці, гаварыла эмацыйна. На пытаньне, што было самым цяжкім у турме, адказала сугучна Аляксандру: «Цяжэй было нашым родным тут, на свабодзе, у чаканьні і невядомасьці».

Эніра кажа, што судзьдзя, наколькі магчыма ў сёньняшняй сытуацыі, прыклаў намаганьні, каб бесстароньне разгледзець справу «Партнэрства». Прысуд мог быць нашмат больш жорсткім, мяркуе яна. Адразу па вызваленьні дзяўчына зьбіраецца пабачыцца з роднымі. «А потым хачу на колькі дзён з намётам выбрацца ў лес, падыхаць вольным паветрам, якога так не ставала ў турме».

Ні Эніра, ні Аляксандар ня скардзіліся на ўмовы ўтрыманьня. Аднак абое адзначылі, што ў гэтай сфэры востра неабходныя зьмены. «Я не кажу пра тое, як утрымлівалі нас дый працягваюць утрымліваць астатніх партнэраўцаў у турме, — кажа А.Шалайка. — Гаворка пра агульныя ўмовы ўтрыманьня ўсіх асуджаных».

З палітыкаў павітаць вызваленых прыйшоў толькі Анатоль Лябедзька ды Людміла Гразнова.

«Калі ведаеш, што сядзіш за праўду, зьняволеньне не падаецца такім цяжкім — у мяне такі рэцэпт трываласьці», — падвёў рысу Аляксандар, перш чым паехаць да сына.

**Сямён Печанко**

# не паведаміў усіх дэталяў працэсу»

рах сядзелі людзі, якія ішлі па палове артыкулаў Крымінальнага кодэксу. Там і забойствы, і эканамічныя злачынствы.

**«НН»: Як Вас дапытвалі?**

**АШ:** Як толькі мяне прывезьлі ў КДБ, сьледчы спрабаваў правесьці нешта накшталт нефармальнай гутаркі. Я адмовіўся размаўляць. 22 лютага ўжо адбыўся афіцыйны допыт, потым яшчэ два допыты, якія вялі супрацоўнікі пракуратуры. Усе яны адбыліся хутка — я адмовіўся даваць паказаньні. За чатыры месяцы сьледзтва — усяго тры допыты.

**«НН»: Старшыня КДБ і генпракурор публічна абвінавацілі «Партнэрства» ў падрыхтоўцы падтасаваных вынікаў экзыт-полаў і арганізацыі тэрактаў у дзень выбараў на Кастрычніцкай плошчы...**

**АШ:** Вядома, гэта лухта. У часе суду ўсе абвінавачваньні ў падтасоўцы вынікаў «экзыт-полу», якія прагучалі на БТ, былі зьнятыя. Што датычыць заяваў Сухарэнкі й Міклашэвіча — гэта было за месяц да выбараў, і яны хацелі стварыць атмасфэру страху, напужаць народ і скампрамэтаваць незалежнае назіраньне. «Партнэрства» не зьбіралася ладзіць апытаньня грамадзкай думкі па выхадзе з выбарчых участкаў, як пра гэта казала БТ. Але не выключаю, што, калі б не было нашага арышту, то гэтай справай маглі б заняцца іншыя. Удар, зроблены па нас, аказаўся надта моцным, каб нехта асьмеліўся ладзіць экзыт-полы.

**«НН»: Вы не зьбіраецеся пакідаць грамадзкай дзейнасьці?**

**АШ:** Вядома, не зьбіраюся. Пытаньне стаіць пра формы ўдзелу. Ня бачу сэнсу спыняць працу толькі з той прычыны, што я адседзеў паўгоду за кратамі.

**«НН»: Аляксандар, ці можна сказаць, што Вы яшчэ не сказалі ўсёй праўды пра судовы працэс?**

**АШ:** Больш правільна будзе сказаць, што я не паведаміў яшчэ ўсіх дэталяў працэсу, бо тое, што я кажу цяпер, ёсьць чыстай праўдай. Проста ёсьць цэлы шэраг іншых падрабязнасьцяў. Калі б я іх цяпер агучыў, то ў краіне не засталося б павагі да праваахоўных органаў, судовых інстанцыяў, дзяржбясьпекі і шмат чаго яшчэ. А гэта ўсё ж патрэбныя ў краіне службы, безь якіх нельга абысьціся ніводнай дзяржаве. Я не хачу канчаткова падрываць іх аўтарытэт.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

# КХП БНФ і Партыя БНФ аб’яднаюцца?

У адным з апошніх сваіх артыкулаў «Яднацца трэба са сваімі» Зянон Пазьняк недвухсэнсоўна намякнуў, што ён ня супраць аб’яднаньня двух крылаў былога Народнага Фронту, Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ з Партыяй БНФ, бо па-ранейшаму працягвае лічыць «вячоркаўцаў» беларускай нацыянальнай сілай, якая змагаецца за беларускую справу. Што думаюць пра магчымасьць узьяднаньня сябры абедзьвюх партыяў?

Юрась Беленькі, намесьнік Пазьняка, кажа, што Зянон заўжды працягваў руку супрацоўніцтва сапраўдным беларускім сілам і ў гэтай прапанове няма нічога дзіўнага. «У 1991 годзе Зянон Станіслававіч прапаноўваў аб’яднацца на нацыянальным падмурку нават сваім апанэнтам — камуністам, калі яны гатовыя былі пакаяцца ў памылках мінулага», — кажа Ю.Беленькі. Разам з тым ён заўважае, што немагчыма ўступаць у хаўрус з такімі людзьмі, як Вінцук Вячорка ці Юры Хадыка, якія з глебы нацыянальнай палітыкі перайшлі да пазыцыяў лібэралізму і прагматызму.

Падобна лічыць і іншы намесьнік, Сяргей Папкоў, які ўпэўнены, што немагчымае аб’яднаньне зь людзьмі, якія стаяць на прарасейскіх пазыцыях. Аднак С.Папкоў адзначае, што ў ПБНФ засталося багата людзей, якія проста заблыталіся, і зь імі патрэбна шчыльней працаваць.

Віктар Івашкевіч мяркуе, што аб’яднаньне КХП і ПБНФ пакуль немагчымае, хоць партыі стаяць на досыць блізкіх нацыянальных пазыцыях. «Але няма сэнсу разбураць дэмакратычную кааліцыю, якая ўжо існуе, і ствараць нейкую сумнеўную з КХП. Мы ня супраць, каб «пазьнякоўцы» ўвайшлі ў склад нашай кааліцыі. Але гэтага хутчэй за ўсё не адбудзецца, бо мы можам прабачыць Лябедзьку і Фядуту, што яны некалі працавалі з Лукашэнкам, а «кахэпісты» — не», — кажа сп.Івашкевіч.

Прафэсар Ю.Хадыка з энтузіязмам успрыняў такую думку З.Пазьняка. «Я асабіста за тое, што нашым партыям трэба аб’ядноўвацца, бо мы стаім на падобных палітычных плятформах. Толькі гэты хаўрус будзе магчымы без такіх людзей, як Папкоў і Беленькі, якія невядома што нагаворваюць Пазьняку пра ПБНФ. Калі будуць канкрэтныя прапановы з боку Пазьняка, то мы іх з радасьцю разгледзім».

Як бачым, у прынцыпе, партыйцы ня супраць пайсьці на збліжэньне адно з адным. Бяда толькі ў тым, што беларускія палітыкі больш баяцца сваіх саюзьнікаў, чым праціўнікаў.

**Зьміцер Панкавец**

## Невядомыя ў цывільным зладзілі кастынг у салдаты

16 жніўня ў Гомелі быў праведзены чарговы флэшмоб з нагоды Дня салідарнасьці. Каля паўтара дзясятка маладзёнаў сталі а 22:30 ля помніка Кірылу Тураўскаму ў цэнтры Гомелю і запалілі сьвечкі (на жаль, арганізатары вырашылі ўдзелу ў акцыі не прымаць і паглядзець збоку).

Пасьля заканчэньня мерапрыемства моладзь пачала разыходзіцца, аднак частка зь іх была затрыманая невядомымі людзьмі ў цывільнай вопратцы, якія назваліся супрацоўнікамі Цэнтральнага РУУС Гомелю. Пасьля гэтага юнакоў (каля дзесяці чалавек) адвезьлі ў гэты самы РУУС нібыта для высьвятленьня асобаў. Там з кожным пагутарылі па шчырасьці і прапанавалі прайсьці кастынг для ўдзелу ў сэрыяле «Салдаты», які й правялі дзьвюма лічбавымі відэакамэрамі і адным фотаздымачом. Прыкладна праз гадзіну юнакоў адпусьцілі без складаньня пратаколаў, аднак, магчыма, ня ўсіх. Мэту затрыманьня і імёны «супрацоўнічкаў» высьветліць так і ня выйшла.

**Гарт**


СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

**Зь «Беларусьсю» пакончана**

**Зруйнаваны будынак першага паваеннага кінатэатру ў Менску. Зь ім зьвязаны ўспаміны трох пакаленьняў менчукоў. Да Лукашэнкі ў ім зьбіраліся разьмясьціць Музэй сучаснага мастацтва. А цяпер будзе паркінг з забаўляльным цэнтрам. Кінатэатар называўся «Беларусь».**

# Беларускамоўнае навучаньне ў лічбах

У Менску па-беларуску вучацца 2,4% школьнікаў.

Вось-вось настане 1 верасьня. Тысячы дзяцей па ўсёй краіне сядуць за школьныя лавы. Інтарэсы беларускамоўных сем’яў адстойвае Таварыства беларускай школы. Дарэчы, 21 жніўня ТБШ адсьвяткавала сваё 85-годзьдзе. У дзень юбілею мы пагутарылі зь ягоным старшынём Алесем Лозкам.

«Казаць пра лічбы беларускамоўнага навучаньня ў гэтым годзе пакуль ранавата, бо клясы яшчэ не сфармаваныя і ніхто не назаве вам дакладную лічбу. Трэба заўважыць, што ў 1993—1994 г. у беларускамоўныя першыя клясы ішлі 76% школьнікаў ад агульнай колькасьці, на Меншчыне гэты паказьнік складаў увогуле 92,6%, пасьля сумнавядомага рэфэрэндуму 1995 году гэтая лічба склала — 38%, летась — 21%. Лічбы гавораць самі за сябе», — кажа Алесь Лозка.

На сёньня ў Менску засталіся толькі чатыры цалкам беларускамоўныя школкі, хоць, да прыкладу, у 2001-м такіх было адзінаццаць. Гэта — сярэдняя школа № 60 у Маскоўскім раёне, гімназіі №9 у Першамайскім раёне і №4 у Фрунзэнскім, а таксама гімназіякаледж Міністэрства культуры ў Цэнтральным раёне. Ёсьць яшчэ закрыты ўладамі Гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа, які працягнуў набор вучняў і гэтым летам. Як бачым, цэлыя сталічныя



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Кожны пяты першаклясьнік паступае ў школы зь беларускай мовай навучаньня.**

раёны засталіся безь беларускіх школаў. Таму, напрыклад, бацькам з Кастрычніцкага раёну, якія хочуць, каб іхняе дзіця вучылася на роднай мове, давядзецца вазіць яго ў іншы раён Менску.

Такім чынам, у Менску летась па-беларуску вучылася ўсяго толькі 2,4% школьнікаў, але гэта найлепшы паказьнік між буйных гарадоў Беларусі, у абласных цэнтрах становішча яшчэ горшае.

Таксама ёсьць шэраг установаў адукацыі, дзе беларуская мова пераважае над расейскай. Гэта — гімназіі №14, 23, 24 і сярэднія школы № 2, 68, 72, 89, 131 і 190. Усяго па Менску ёсьць 43 школы зь дзьвюма мовамі навучаньня.

«Большасьць беларускамоўных школаў працуюць у гуманітарным профілі, гэта паглыбленае вывучэньне моваў, гісторыі, грамадзказнаўчых дысцыплінаў», — гаворыць сп.Лозка. Міністэрства адукацыі працягвае знаходзіцца ў каляніяльных стэрэатыпах, упэўненае, што па-беларуску нельга якасна вывучаць фізыку, матэматыку ці хімію.

Увогуле па краіне ў мінулым навучальным годзе па-беларуску займалася 23,3% школьнікаў. Між іншым, ЮНЭСКО лічыць, што мова знаходзіцца пад пагрозай зьнікненьня, калі на ёй вучацца менш за 30% насельніцтва. На Гомельшчыне ж па-беларуску займалася ўсяго толькі 17% вучняў.

«Міністэрства адукацыі любіць казыраць тым фактам, што амаль 62% школаў па краіне беларускамоўныя, — кажа Алесь Лозка. — Але ня трэба забывацца, што ў асноўным гэта малакамплектныя школы ў вёсках, якія паступова зьнікаюць. Кожны год улады закрываюць прыблізна сто школаў, і ў асноўным гэта ўсё беларускамоўныя ўстановы».

Алесь Лозка не губляе надзеі, ён бачыць пазытыўныя зрухі ў тым, што сёлета цэнтралізаванае тэставаньне па беларускай мове здавала прыкладна столькі ж абітурыентаў, колькі і па расейскай, нягледзячы на татальны пераўзыход расейскай мовы над беларускай у навучальным працэсе.

Дый саму лічбу 2,4% беларускамоўных школьнікаў у сталіцы на 12-м годзе лукашэнкаўскага кіраваньня можна расцэньваць як заваёву. Старэйшыя памятаюць, што пры канцы СССР у Менску не было ніводнае беларускамоўнае клясы.

**Зьміцер Панкавец**

# На Чаркізаўскім загінула й беларуска

Пра гэта карэспандэнту «НН» паведамілі ў прэсслужбе Міністэрства замежных спраў. Імя дзяўчыны з этычных прычынаў не раскрываецца.

Паводле расейскіх СМІ, ужо затрыманыя трое маладых людзей (студэнты розных маскоўскіх ВНУ), якія вінавацяцца ў тым, што вырабілі і заклалі бомбу. Следчыя ўпэўненыя, што галоўная прычына іх учынку — ксэнафобія (у гэтым выпадку нянавісьць да неславянаў) і гамафобія. Напрыклад, іх нядаўна бачылі на антыгейскай дэманстрацыі.

WWW.NG.RU




У выніку выбуху бомбы, што ўзарвалася ў кавярні ў панядзелак а 9.30 па менскім часе на Чаркізаўскім рынку Масквы, загінулі восем чалавек. Двое памерлі потым у больніцы. 47 чалавек атрымалі раненьні рознай ступені цяжкасьці, 35 чалавек былі шпіталізаваныя.

**АГ**

# Пад Сьветлагорскам знайшлі горад Казімер

У Сьветлагорскім раёне рыхтуюцца археалягічныя раскопкі з мэтаю вызначыць месца знаходжаньня гораду Казімеру, які існаваў у XVII стагодзьдзі. У раскопках возьмуць удзел аматары краязнаўства. Зьвесткі аб невядомым раней горадзе выявіў Сяргей Рассадзін — прафэсар катэдры гісторыі і паліталёгіі Беларускага дзяржаўнага тэхналягічнага ўнівэрсытэту, доктар гістарычных навук. «У Варшаве я знайшоў прывілей, які падпісала ў 1643 г. Цэцылія Рэната — каралева Рэчы Паспалітай. Згодна з прывілеем, надавалася магдэбурскае права гораду Казімеру ў Бабруйскім старостве. У дакумэнце ёсьць і герб Казімеру — леў на чырвоным шчыце», — кажа С.Рассадзін. Прывілей захоўваецца ў Галоўным архіве старадаўніх актаў Польшчы.

На думку дасьледніка, Казімер быў разбураны ў час вайны ў 1655 г., а на яго месцы цяпер знаходзіцца вёска Каралёўская Слабада Сьветлагорскага раёну. Сёлета тут ўжо двойчы праводзіліся археалягічныя выведкі з удзелам мясцовай грамадзкасьці. У ходзе выведак было вызначана, што горад сапраўды мог разьмяшчацца тутака. Раскопкі пройдуць у Каралёўскай Слабадзе 23—27 жніўня пад навуковым кіраўніцтвам С.Рассадзіна пры дапамозе Таварыства беларускай мовы.

**Паводле belngo.info**

# Падсуднаму беларусу ў Маскве ня могуць знайсьці перакладчыка

Працэс над Юрасём Іванюковічам у Маскве зноў адкладзены да 30 жніўня. Суд дагэтуль ня можа знайсьці якаснага перакладчыка. Адвакат Станіслаў Маркелаў кажа, што прапанаваная перакладчыца ня здолела зьвязна патлумачыць ніводнага пытаньня і ніводнага адказу: «Яна ня ведае ні слова па-беларуску наагул. Але гэта прафэсійны перакладчык — адзіны, які ёсьць, як я ведаю, ва ўсёй Расеі. Іванюковіч не зразумеў нічога, што яна перакладала, і я таксама не зразумеў. Яна проста ня можа перакладаць». Нагадаем, што Іванюковіча судзяць за надпісы «Жыве Беларусь» і «БТ ілжэ», зробленыя ім на будынку беларускай амбасады ў Маскве.

WWW.PRIMA-NEWS.RU



**Юрась Іванюковіч.**

**Эўрапейскае радыё для Беларусі**

# Беларусы ўзялі ўдвая болей крэдытаў

WWW.CORBIS.COM



Крэдыты ў Беларусі сталі больш даступныя. Аб гэтым прэзыдэнту Беларусі далажыў старшыня праўленьня Нацбанку Пётра Пракаповіч, паведамляе БелТА. У выніку гэтага вырасла колькасьць выдаваных крэдытаў (больш як у 2 разы на спажывецкія патрэбы і ў 1,7 раза — на будаўніцтва жытла).

**МБ**

# На ўкраінскай заставе ганяліся за беларусамі

Чацьвёра грамадзянаў Беларусі былі затрыманыя памежным нарадам заставы «Дабранка» чарнігаўскага атраду а 1-й гадзіне ночы.

Беларусы кешкаліся каля аўтамабіля «фольксваген» літоўскай рэгістрацыі, пакінутага непадалёк ад пункту пропуску «Новыя Ярылавічы», і, хутчэй за ўсё, мелі намер разрабаваць яго. На воклік памежніка беларусы, мужчыны ў веку ад 26 да 29 гадоў, кінуліся ўцякаць у розныя бакі. Каб іх спаймаць, памежнікам давялося зрабіць асьвятляльны стрэл. Урэшце беларусаў затрымалі за злоснае непадпарадкаваньне памежнікам, і найбліжэйшым часам іх чакае суд.

Што да аўтамабіля, каля якога памежнікі выявілі парушальнікаў, то высьветлілася, што ён належыць грамадзяніну Літвы. Літовец ня меў адпаведных дакумэнтаў для таго, каб перасячы дзяржаўную мяжу ў Беларусь, а таму вырашыў пакінуць свой транспартны сродак непадалёк ад пункту пропуску.

**Паводле «Високий вал»**

# Ці ўратуе «Шымана» рэпутацыю Мотавэля?

Першую партыю горных ровараў выпусьцілі на Менскім мотавэлязаводзе. Пакуль спажыўцу прапануецца дзьве мадэлі. Штодня вырабляецца каля трыццаці горных ровараў. Сёлета да канца году маюць выпусьціць тысячу штук. Няясна пакуль, які будзе попыт на іх у бязгорнай Беларусі. Партнэрам заводу стала японская кампанія «Шымана» — вядучы

сусьветны вытворца горных ровараў. Трэба зазначыць, што горныя ровары ўласнай распрацоўкі на Мотавэля выпускаліся ў 1999 годзе, але замацавацца на рынку ня здолелі.

**АК**

## У Празе адкрылі Беларускі клюб

На прэзэнтацыі прысутнічала блізу 30 чалавек зь ліку эмігрантаў, палітуцекачоў, а таксама грамадзянаў Беларусі, якія па прыватных ці службовых справах знаходзіліся гэтым часам у сталіцы Чэхіі. Ініцыятарам заснаваньня Беларускае клюбоўні ў Празе стаўся Юрка Станкевіч (сын Яна Станкевіча).

Афіцыйнае адкрыцьцё Беларускае клюбоўні прайшло ў выглядзе невялічкага фуршэту. Свае вершы прысутным чытаў малады паэт зь Беларусі Глеб Лабадзенка. Цэнтральнай жа часткай імпрэзы сталася прэзэнтацыя мастака Алеся Пушкіна, які гэтымі днямі гасьцяваў паводле прыватнага запрашэньня ў Празе.

**Паводле радыё «Рацыя»**

## Падатак на капусту

Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчаваньня прапануе ўвесьці сэзонныя мытныя пошліны на ўвоз у краіну некаторых відаў гародніны. Падрыхтаваны праект адпаведнай пастановы. Прапануецца ўвесьці мыты на імпартную цыбулю галоўкамі, моркву, чырвоныя буракі й капусту. У Мінсельгасхарчы патлумачылі, што сэзонныя пошліны ўводзяцца з 2003 г., каб абараніць айчыннага вытворцу. У той жа час не плянуецца абкладаць пошлінай завозную бульбу. Летась сэзонныя ўвозныя пошліны дзейнічалі з 1 верасьня. Стаўка мыта на цыбулю складала 100% мытнага кошту тавару, на бульбу — 50%, моркву і буракі — 60%, капусту — 35%.

**Bsb.by**

## Менскія аўтобусы перафарбуюць у зялёны колер

Усе аўтобусы прадпрыемства «Менсктранс» мусяць быць зялёнага колеру. Такое рашэньне прынялі сталічныя транспартнікі. Новыя аўтобусы МАЗ ужо даўно выпускае менавіта такога колеру, а вось старыя давядзецца абнавіць.

Як паведаміў агенцтву «Менск — Навіны» начальнік вытворча-тэхнічнага аддзелу прадпрыемства «Мінсктранс» Аляксандар Шкуратаў, гэта ня значыць, што ўвадначас усе машыны перафарбуюць у зялёны колер. Напачатку афарбоўку памяняюць тыя, якія зь цягам часу прыцьмелі, абшарпаліся і вымагаюць афарбоўкі. Для гарадзкіх тралейбусаў транспартнікі таксама распрацоўваюць адзіную колерную гаму — але пакуль выбіраюць з трох варыянтаў.

**АК**




**У сьцяну новага касьцёлу ўмуравалі тры гістарычныя цагліны.**

## Наша збожжа ў агні не гарыць і ў вадзе ня тоне

Сёлетні год нарабіў клопату сялянам усходу Эўропы: моцныя маразы ўзімку, суша сярод лета ды залева ў разгар жніва. Польскае Міністэрства сельскай гаспадаркі прагназуе недабор зерня ў памеры 20% леташнага ўраджаю, Літва страціла траціну ўраджаю (страты ацэньваюцца ў 170 млн эўра), у Расеі не дабяруць амаль 10 млн т, ва Ўкраіне, празь зімовае вымярзаньне пшаніцы, — 3,7 млн т. І толькі беларускім нівам ня страшныя ні маразы, ні суш, ні буры.

Калі верыць БТ, БелТА і намесьніку міністра сельскай гаспадаркі Васілю Паўлоўскому, плянуецца атрымаць 7,2 млн т збожжа — нават болей, чым летась. Ураджайнасьць у сярэднім складае аж 29,3 ц/га. Найлепшыя паказчыкі зафіксаваныя ў Гарадзенскай вобласьці — 36 ц/га, найменшыя ў Гомельскай — 24 ц/га.

Над гэтым фэноменам варта задумацца.

**Сямён Печанко**

## У Клецку паўстане новы касьцёл

20 жніўня ў парафіі Найсьвяцейшай Тройцы ў Клецку адбылася закладка нарожнага каменя пад новы касьцёл. Гэтую ўрачыстасьць узначаліў апостальскі адміністратар Менска-Магілёўскай архідыяцэзіі біскуп Антоні Дзям'янка. Касьцёл існаваў у Клецку з 1459 г. У міжваенны час парафія налічвала каля пяці тысяч вернікаў. Аднак гітлерцы расстралялі клецкіх сьвятароў, а ў 1953 г. савецкія ўлады ўзарвалі сьвятыню. Намаганьнямі клецкага пробашча кс.Эрвіна Вячоркі MSF будуецца новы касьцёл.

Удзельнікі ўрачыстасьці заклалі ў муры новай клецкай сьвятыні тры гістарычныя цагліны з колішняй разбуранай. На малітву вернікаў будзе склікаць гук старажытнага звана вагою амаль у тону, які захоўваўся ў дзяржаўным музэі і нядаўна быў вернуты парафіі.

**Catholic.by**

## Глеб хацеў паўтарыць подзьвіг Зыдана




У тую сераду футбольная зборная Беларусі правяла соты матч у сваёй гісторыі. Суперніка для юбілею выбралі не наймацнейшага — Андору. Беларусы пераўзышлі пірэнэйцаў на галаву: 3:0. Адзін з галоў забіў лідэр зборнай Аляксандар Глеб зь лёнданскага «Арсэналу». У адным з эпізодаў матчу наш паўабаронца ўвязаўся ў канфлікт з андорскім абаронцам **(на фота)**, але ўсё скончылася ціха.

Зь іншых спартовых цікавостак: тэнісіст Макс Мірны ў пары з швэдам Юнасам Б'ёркманам перамог у парным разрадзе турніру сэрыі «Мастэрз» у Цынцынаці.

**Зьміцер Панкавец**

# У Бабруйск!



АЛЕСЬ МАТАФОНАЎ

Бабруйскі пляц. Пераддажынкі-2006.

*У дзень, калі ты садзіў,*
*ты калаціўся, каб яно*
*расло, і каб пасеянае*
*табою рана закрасавала;*
*але ў дзень збору*
*не багатае жніво будзе,*
*а пакута вялікая.*
**Кніга прарока Ісаі**

## Фарбуюць усё, што толькі можна

Бабруйск, насуперак стэрэатыпам, — вельмі прыгожае места. Яго выгодна адрознівае ад усіх гарадоў і мястэчак Беларусі ўнікальная радыяльная пляніроўка, гарысты краявід, паўнаводныя рэкі, безліч помнікаў дойлідзтва самых розных кшталтаў і эпох.

Але гэтымі днямі ў Бабруйску невясёла.

Горад літаральна кіпіць і гарыць халодным полымем клопату. Фарбуюць усё, што толькі можна. Прыстукваюць плітку паўсюль, дзе толькі ходзяць. Горад перарыты траншэямі, застаўлены будматэрыяламі. І нават на выходныя няма тут спакою. Згодна з плянам добраўпарадкаваньня і рэканструкцыі, да сельскагаспадарчага сьвята павінны быць падрыхтаваныя 555 аб'ектаў — на будоўлях Бабруйску занятыя каля 10 тысячаў будаўнікоў з усяе краіны. Адпаведна, столькі гасьцей Бабруйск ня бачыў ніколі. Праз гэта ў горадзе ня тое што пераначаваць, але пад'есьці — праблема. Як сонца надвячоркам залоціць вершаліны дрэваў, то зьнямоганыя за дзень людзі ціха запаўняюць рэдкія пункты грамадзкага харчаваньня. Яны сувора й засяроджана рыхтуюцца адзначыць канец жніва.

Сёньня Бабруйск нагадвае велізарную будаўнічую пля-



АЛЕСЬ МАТАФОНАЎ

Аўральны рамонт райвыканкаму.



АЛЕСЬ МАТАФОНАЎ

Увага! Нас фатаграфуюць!

цоўку. У райвыканкаме ўвесь дарагі паркет заквэцаны крэйдаю й фарбамі. Але праца не спыняецца! Чыноўнікаў тут, як заўжды, болей, чым усіх рабочых. Гарачая пара! Усе мітусяцца, правяраюць, пералічваюць. А пад Леніным на плошчы тужліва соўгаюцца рабацягі. Не пасьпелі да 15 жніўня скончыць. Не пасьпелі! Пастаўшчыкі падводзяць! Бракуе пліткі! Не хапае граніту! Але тут ужо пачынаецца мантаж 1500 месцаў для будучых пераможцаў. Бо самае важнае — каб усё спадабалася перадусім самаму галоўнаму сейбіту. Нават калі ўвесь горад над Бярэзінай засынае, у электрычным зьзяньні на галоўнай бабруйскай плошчы яшчэ застаюцца работнікі.

## Курапаткі ў крэпасьці

Разам з тым сотні помнікаў бабруйскае старасьвеччыны, сярод якіх ёсьць гэткія ўнікальныя здабыткі, як велізарная крэпасьць часу Напалеона, езуіцкі калегіюм з касьцёлам XVIII ст., палацы ды тузін сынагог, застаюцца без дагляду. Нягледзячы на ўсе руйнаваньні, у Бабруйску шмат захавалася даўніны. Колькасьць помнікаў тут уражвае. Але выдатны тутэйшы музэй ледзьве зьмяшчае ўсе свае скарбы ў сховах, а лядашчая выстаўная заля гораду вартая адно скрухі. Тое самае тычыцца й некалі слыннага сваім нон-канфармізмам тэатру імя Дуніна-Марцінкевіча і тутэйшых кінатэатраў, бібліятэк і дамоў культуры... Ці ня самы яркі сымбаль стаўленьня ўладаў да старажытнасьцяў Бабруйску — гэта вялікія чароды курапатак ды перапёлак, што ўзьлятаюць з-пад ног... пасярод велічных гмахаў крэпасьці. Поўнае зьдзічэньне й цывілізацыйны заняпад. Варта адысьці колькі кварталаў ад цэнтру гораду, дзе шумна імітуюць бурную дзейнасьць чыноўнікі, паганяючы тысячы будаўнікоў. *...I расьсеяўся народ па ўсёй зямлі Эгіпецкай зьбіраць жніво замест саломы. А прыстаўнікі пануквалі, кажучы: выконвайце... (Біблія. Сыход.)*

## Жнуць усё запар

Бабруйскія тубыльцы наракаюць на будоўлю гмаху гатэлю «Турыст», што расьсеўся ўздоўж Бярэзіны. Паводле нормаў, тэрмін будаўніцтва не павінны перавышаць 5 гадоў, а закінуты недабудаваны гатэль стаіць ужо з 1989 году! Ды раптам пасьля 15-гадовай кансэрвацыі ён мусіць мець 5 зорак! А побач узводзяць і забаўляльны цэнтар. У Бабруйску ходзяць чуткі, нібы той даўгабуд спавілі сталёвымі сьця́жкамі, і, пэўна, пасьля «Дажынак» тут спатрэбіцца капітальны рамонт.

Але беларускае чынавенства часам дэманструе выбітныя фокусы палітычнае эканоміі.

Падчас сёлетняга фэсту «Дажынкі-2006» усе гандлёвыя арганізацыі, што прыедуць у Бабруйск, будуць вызваленыя ад платы падаткаў і збораў. Лібэралізм безь берагоў. Гэта нібыта дазволіць зьменшыць выдаткі на арганізацыю гандлю, а таксама зьменшыць цану продажу на айчынныя тавары на 5%, а на імпартныя — на 10%! Налятай!

Аж дух займае. Міжволі пачынаеш нэрвавацца й хваляваццца за гэты сымпатычны горад. Што ж будзе пасьля сьвята? Як ім тут будзе, як усе госьці разьедуцца?

Між тым нават у ваколіцах Бабруйску пра ўраджай гавораць зь непрыхаваным скепсісам. Чаго толькі сёлета ні было: замаразкі, суша, а цяпер, нарэшце, залевы. Пахмурныя дзядзькі, якім не даюць пахмяляцца, жорстка крытыкуюць калгаснае начальства, што не дае людзям продыху, а ўраджаю — нармальнае сьпеласьці. Жнуць усё запар, нясьпелае й мокрае. Імкненьне любым коштам ставіць рэкорды відавочна не дадае аптымізму.



ВЕРАНІКА ДЗЯДОК

**Касьцёлу, што на тэрыторыі былой вайсковай часткі, няма нават у сьпісах ацалелых архітэктурных помнікаў.**



ВЕРАНІКА ДЗЯДОК

**Інтэр'еры бабруйскай крэпасьці.**




АЛЕСЬ МАТАФОНАЎ

Плыве гэта песьня ка мне
і заве,
І ў сэрцы зьвініць, як каса
у траве:
*«Ты так жа, брат, сееш...*
*дзе твае жніва?»*

**Сяргей Харэўскі**

# Гэтым пераможам

Што нацыянальнаму руху рабіць зь дзяржавай? Разважае **Сяргей Богдан.**

Насельніцтва Беларусі пакладаецца на дзяржаву ва ўсім чыста. Носьбіты нацыянальнай сьвядомасьці ў гэтым не адрозьніваюцца ад рэшты суграмадзянаў (праўда, яны маюць на ўвазе іншую, не цяперашнюю дзяржаву). Важнай асаблівасьцю іх перакананьняў даўно была і ёсьць упэўненасьць, што свая ДЗЯРЖАВА будзе ўнівэрсальным сродкам вырашэньня нацыянальных праблемаў («прыйдуць нашы — разьбяруцца»). Таго і спадзяваліся ад наваствoранай незалежнай Рэспублікі на пачатку 1990-х.

Тады гэта можна было даравацъ, зважаючы на палітычную наіўнасьць. Але сёньня мяне зьдзіўляе чаканьне, што перамога на выбарах дэмакратычнай апазыцыі можа карэнным чынам зьмяніць краіну. Маўляў, дастаткова правесьці вольныя выбары дый забраць палітычную ўладу ў краіне — вось і ўсё рашэньне нашых бедаў.

Між тым, выбары ёсьць толькі малой часткай гэтага рашэньня. Бо перамога дэмакратычнай апазыцыі на іх дазволіць зьмяніць адно вышэйшае кіраўніцтва дзяржавы. Мо' яшчэ бюракратычны аппарат (праз гады). Ня зьменяцца ні лад мысьленьня грамадзянаў, ні самі дзяржаўныя мэханізмы. Спадзяваньні нацдэмаў на перамогу выключна шляхам апанаваньня дзяржавы праз выбары сьведчаць пра неразуменьне сутнасьці дзяржавы, якой надаюць проста-такі антрапамарфічныя рысы.

Чалавечыя рысы дзяржаве надаваць ня варта, бо яна — не Левіятан, больш ці менш пасьлядоўны ў сваіх паводзінах, а складаны мэханізм, розныя часткі якога рухаюцца часам адна насуперак адной — то бок левая рука ня ведае, што робіць правая. Ня варта і пэрсаналізаваць дзяржаву, бо, вядома, ва ўсім сьвеце прэзыдэнты могуць стварацъ культ сваёй асобы, чыніць тэрор, але нават у самай маленькай краіне яны абапіраюцца на апарат (які складаецца зь вельмі розных людзей) і таму нават пры моцнай арыентацыі цяперашняй беларускай дзяржавы на адну асобу няварта атаясамліваць дзяржаву і гэтую асобу.

Складанасьць прыроды дзяржаўнага апарату цягне за сабой выснову: сёньня нядбайнасьць і самавольства чыноўнікаў гэтага апарату ратуюць рэшткі свабоды, заўтра яны ціхенька «прысыпяць» дэмакратычныя перамены. Контрарэвалюцыйнага намеру чыноўнікі мець ня будуць, проста яны працягнуць працаваць «па-старому» (а як жа яшчэ ім працаваць праз трыццаць гадоў «заслужанага стажу»?). Калі чыноўнік дэманстрацыйна не разумее нашае мовы, дык не таму што ён антыбеларускі дэман у чалавечай скуры. Ён савецкі чыноўнік, і яго сутнасьць у тым, каб не разумець беларускай мовы, гэтаксама, як і сутнасьць скарпіёна ў тым, каб джаліць.

Пытаньне стаіць востра: што нацыянальна-дэмакратычнай апазыцыі рабіць зь дзяржавай?

## Вучыцца ў эўрапейскіх імігрантаў

Перш за ўсё, трэба адмовіцца ад ілюзіяў і спадзяваньняў на дзяржаву і дзяржаўныя структуры ўвогуле. Маўляў, вось толькі варта «нашым» заняць тыя кабінэты і... Відаць, у

> Дзяржава — не Левіятан, а складаны мэханізм, розныя часткі якога рухаюцца часам адна насуперак адной.

стабільнай дэмакратычнай сыстэме так і было б, але не ва ўмовах постсавецкай краіны Ўсходняй Эўропы. Нават пасьля магчымага прыходу да ўлады дэмакратычнай апазыцыі краіне спатрэбяцца дзесяцігодзьдзі, каб збудаваць дэмакратычную сыстэму і пазбыцца спадчыны старога рэжыму. Таму антыдэмакратычныя эксцэсы з боку дзяржаўных органаў будуць працягвацца і пасьля фармальнай перамогі дэмакратаў.

Выйсьце ў асымэтрычным падыходзе. Перамога не ў заняцьці кабінэтаў, бо проста займаючы іх, дэмакраты пачнуць граць паводле чужых правілаў, у навязанай рэжымам сыстэме каардынатаў ды прайграюць. Гэта будзе нават не гульня ў чужых правілах, а танцы пад чужую дудку.

Трэба зьмяняць правілы і сыстэму каардынатаў. Сёньняшні прыярытэт — разбудова грамадзтва, *свайго* грамадзтва. Узорам служаць імігранты, што стварылі ў Нямеччыне ды іншых краінах Заходняй Эўропы сваё паралельнае грамадзтва. Яно выклікае праклёны тубыльнага насельніцтва і спэцслужбаў, але дазваляе людзям захаваць нацыянальную годнасьць. На сёньня выйсьце для нацыянальна-дэмакратычнага руху акурат у гэтым.

Калі дзяржава і ўлада не прызнаюць нашых правоў у сваіх рамках, варта будаваць уласныя рамкі. Гэта шмат у чым дазволіць пазьбегнуць бясплённага гвалтоўнага процістаяньня, бо працаваць дэмакраты і рэжым будуць у розных плашчынях. Нефармальныя задзіночаньні людзей і перасьледаваць куды цяжэй, чым незарэгістраваныя (і пагатоў зарэгістраваныя!) арганізацыі. Бо перасьледнікам няясна, пра што ўвогуле ідзецца, хто да іх належыць, у чым іх вінаваціць. Вядома, гэта ня дасьць «карцінак» для Сі-Эн-Эн, але дазволіць рэальна зьмяніць грамадзтва і краіну.

## Міжнародных нормаў не існуе

Трэба адмовіцца ад спадзяваньняў на цяперашнюю Рэспубліку (я маю на ўвазе палітычную адзінку, а не незалежнасьць). Рэспубліка Беларусь ніколі не адбудуе дэмакратычную беларускую нацыю. Яна будзе крэольскую нацыю, «тоже-белоруссов». Котка ня можа нарадзіць ільва. Замена чыноўнікаў і дэпутатаў ня вырашыць нацыянальна-дэмакратычных заданьняў, бо мэханізм і сыстэма — савецкія. Неабходна нанова перастварацъ дзяржаву на новых мадэрных дзяржаўных мэханізмах. Кожная дзяржава адпавядае пэўнаму грамадзтву, а сёньняшняя Рэспубліка ня можа абслугоўваць разьвіцьцё іншага, несавецкага грамадзтва ў

прынцыпе.

Кажучы пра адмову ад спадзяваньняў на гэтую Рэспубліку, я кажу ня толькі пра абстрактную адмову ад летуценьняў, але і, напрыклад, пра марныя спробы перасьледаваць прадстаўнікоў цяперашняга рэжыму паводле законаў гэтага самага рэжыму. Нацдэмы палоненыя дзьвюма аблудамі.

Першая: аб беззаконьні рэжыму. Беларускі рэжым усё ж не афрыканскага кшталту, *свае* законы ён выконвае, і гэтыя законы зафіксаваныя пісьмова, таму казаць пра беззаконьні не выпадае. Трэба разумець зьменлівую сутнасьць закону як панятку. Можна рабіць жахлівыя рэчы законна, калі толькі своечасова паклапаціцца пра адпаведную нарматворчую дзейнасьць. Беларускі рэжым выконвае свае законы. Як выконваў, напрыклад, гітлераўскі рэжым свае «Нюрнбэрскія законы», скіраваныя на вынішчэньне жыдоў. Дык вось, кажучы пра законнасьць, варта не зьвяртацца да сумленьня чыноўнікаў, каб прымусіць іх да абстрактнага выкананьня законаў, а зазначаць, што пэўныя законы, напрыклад, не адпавядаюць правам чалавека, нацыянальным інтарэсам і ўвогуле нашым уяўленьням пра тое, якімі яны павінны быць. І таму яны павінны быць зьмененыя.

Другая аблуда: перакананьне ў існаваньні міжнародных і эўрапейскіх стандартаў — дэмакратыі, юрыспрудэнцыі і г.д. Няма такіх стандартаў. Ёсьць пэўныя нормы ЭЗ, ААН і мноства іншых інстанцыяў, але «стандартаў» няма, і казаць пра неадпаведнасьць рэжыму міжнародным стандартам досыць дзіўна. Казаць ізноў жа трэба пра неадпаведнасьць рэжыму нацыянальным інтарэсам беларусаў, разьвіцьця краіны і г.д. Гучыць пераканаўча і больш лягічна.

## РБ — толькі этап

Беларуская нацыя адродзіцца па-за дзяржавай, а пасьля ўжо разбудуе свае дзяржаўныя структуры. Нацыю *можна* збудаваць па-за дзяржаўнымі рамкамі, і ў сьвеце мноства прыкладаў таго, як ва ўмовах паралельных грамадзтваў паўставалі нацыі. Паралельнае грамадзтва можа вытрымліваць самы жорсткі ціск. Калі ж яно дасягне пэўнага роўню разьвіцьця — вось тады беларускае грамадзтва зможа вызначыцца з сваімі дзяржаўнымі формамі.

Пераняць дзяржаўную ўладу сёньня — значыць зьмяніць імя кіраўніка на шыльдзе. Павінна паўстаць новая сыстэма дзяржаўнага кіраваньня. Яна будзе вынікам эвалюцыі грамадзтва, а не эвалюцыя грамадзтва будзе вынікам намаганьняў «нашай» дзяржавы. Формула такая: ад грамадзтва да дзяржавы. Калі наадварот — мы атрымаем крэольскую нацыю ў стылі Лукашэнкі.

Пры гэтым, вядома, я не кажу пра самаізаляцыю і сыход у гета нацыянальна-дэмакратычных сілаў. Актыўнае змаганьне іх павінна працягвацца. Але звычайныя палітычныя камбінацыі не дазволяць ім перамагчы. І яшчэ, нават пасьля фармальнай перамогі дэмакратаў на выбарах, агучаныя гэтта тэзы захоўваюць сваю слушнасьць. Кажучы пра выхад з звычайных рамак палітыкі, накіраванай на замену «кепскіх хлопцаў» у вярхах на «добрых», я маю на ўвазе НЕАТАЯСАМЛІВАНЬНЕ сябе зь цяперашняй Рэспублікай і яе сыстэмай увогуле. Але пры тым, безумоўна, варта імкнуцца заняць пасады ў гэтай дзяржаве і пераняць уладу ў ёй. Бо акурат такім чынам нацдэмы і атрымаюць магчымасьць пераствараць дзяржаву. Рэспубліка Беларусь — толькі пачатковы этап у разьвіцьці нашай нацыянальнай дзяржаўнасьці. Мець зь ёй справы трэба, але памятаючы аб яе савецкай прыродзе і генэзісе.

> Ён — савецкі чыноўнік, і яго сутнасьць у тым, каб не разумець беларускай мовы, гэтаксама, як і сутнасьць скарпіёна ў тым, каб джаліць.

## Made in нянаша

У цяжкіх умовах, пад ціскам апанэнта заўжды ёсьць спакуса пачаць прымаць умовы, якія яшчэ ўчора здаваліся немагчымымі, зьмірыцца зь непазьбежным і нават шукаць у тым уцеху. Ці ня ёсьць цяперашні прэзыдэнт насамрэч «неапазнаным» нацыянальным правадыром? — ужо разважаюць некаторыя палітыкі. Паяднацца з рэжымам і прыняць яго праект савецкай Беларусі — вось сэнс прапановаў сп.Фядуты, высунутых пару месяцаў таму. Між тым прэзыдэнцкі праект і праект нацыянальнага адраджэньня і нацыянальнага руху фундамэнтальна розныя. Да таго ж сілы цяперашняга рэжыму нашмат большыя, чымся нацыянальнага руху, які будзе задушаны ў гэтым хаўрусе. Для нацыянальнага руху важна захоўваць маральную перавагу і не далучацца да сумнеўных палітычных камбінацыяў. Першым прынцыпам павінна быць адстойваньне *свайго* праекту беларускай Беларусі. Будаваць яе будзем усе, у тым ліку і прадстаўнікі рэжыму. Але толькі пасьля таго, як яны сапраўды прымуць НАШ праект.

## Хрысьціянства і нацыяналізм

Маральная перавага важная для нацыянальна-дэмакратычнага руху і з прагматычных меркаваньняў. Шмат гаворыцца аб палітычных тэхналёгіях, якімі павінны скарыстацца нацыянал-дэмакраты, каб перамагчы. Але ў тэхналягічным пляне заўжды выйграе дзяржава, бо яна можа дазволіць сабе наймаць падрыхтаваных штатных чыноўнікаў, што, карыстаючыся магчымасьцямі дзяржапарату і яго рэсурсамі поўны працоўны дзень, у тэхналягічным пляне ЗАЎСЁДЫ абыдуць дэмакратаў, якія працуюць бяз сталага фінансаваньня і час ад часу. Таму для нацыянал-дэмакратычнага руху такімі важнымі ёсьць акурат маральныя каштоўнасьці. Каштоўнасьці, а не тэхналёгіі дазволяць стварыць беларускую Беларусь. Гэта — тое, што мы баронім, гэта тое, чым мы баронімся. Дэмакратычная Беларусь будзе створаная сіламі, якія цьвёрда прытрымліваюцца арыентацыі на такія каштоўнасьці. Я маю на ўвазе перадусім хрысьціянаў ды нацыяналістаў (у дакладным значэньні гэтых словаў). Пытаньне маральнасьці, што мае першаснае значэньне для хрысьціянскага і нацыяналістычнага рухаў, ператварае гэтыя рухі ў носьбіты і рухавікі пераменаў. На гэта цяпер ня могуць прэтэндаваць ні лібэралы, ні якая іншая сіла.

* * *

Зянон Пазьняк слушна кажа: «На сёньняшні дзень Беларусь, фактычна, апынулася без нацыянальнай палітычнай альтэрнатывы». Альтэрнатыва павінна паўстаць як альтэрнатыўная сыстэма, а ня спроба перапраграмаваць старую сыстэму.

*Маладэчна*

# Калі беларусы



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

## ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

Штогод у другой палове чэрвеня ў сіценскім леспрамгасе пачынаюцца павальныя звальненьні — з уласнага жаданьня. Чым далей у лета, тым болей вяскоўцаў прыгадваюць колішнія вытворчыя крыўды, выбухаюць ад наймалейшае іскры, выказваюць начальству ўсё, што намножылася за цэлы год, ляпаюць на стол заявы — і сыходзяць у лес.

Не падумайце, гэта не сэзоннае абвастрэньне псыхічных хваробаў і не эфэкт «максімкі». Гэта цьвёрды разьлік. За адзін дзень у ягадах сіценцы могуць зарабіць столькі ж, колькі за месяц працы на эстакадзе. Таму, як толькі лес запаўняецца пахам сакаўных этэраў, вёска дружна выдыхае: «Дачакаліся!..»

Сёлета, прыкладам, чарніцы прымаюць па 5 тысячаў за кіляграм, а для тутэйшага ягадніка, ды яшчэ ўзброенага «машынкай» (няхітрае прыстасаваньне на ўзор бляшанае пяцярні), сабраць за сьветлавы дзень 20—25 кіляграмаў — як той казаў, справа тэхнікі.
І вось зранку вёска, не зважаючы на сьпёку, дождж, аваднёў, камароў, бярэ плеценыя кашы ды плястмасавыя вёдры і збрыдае ў лес. Нават тыя, хто застаўся працаваць у Алёшчы, пасьля зьмены дабіраюцца да Сітна пешкі з «тарачкай» ды цягнуць з сабою колькі кілё тых чарніцаў. За пару месяцаў ягаднага сэзону можна ***зрабіць бізнэс.***

Але ў большасьці сіценцаў ідэі намнажэньня капіталу выклікаюць клясавую агіду — яны аддаюць перавагу натуральнаму абмену й жывуць адным днём. У крамах ці на «кропках», дзе прымаюць ягаду, вядро чарніцаў мяняецца на блёк цыгарэтаў, 2 бутэлькі «віна» або «паўтарашку» «максіма» ды сякую-такую закусь — і ўжо нараніцу балючая галава, галодны страўнік і пустыя кішэні зноў гоняць небараку ў гушчары.

У лесе сіценцы арыентуюцца выдатна. Паходы пешкі па 15—20 км тут — звыклая справа; часьцяком ходзяць «Расею чысьціць» — за межавую просеку, дзе люду менш, а ягады большыя, і, як праўдзівыя партызаны, імкнуцца выперадзіць суседзяў-вяскоўцаў у запаветных месцах.

Зрэшты, багацьця сіценскіх лясоў хапае на ўсіх. Сотні вяскоўцаў, дзясяткі прыежджых, што дэсантуюцца з кожнага полацкага дызэля, нават віцебскія ды сталічныя ягаднікі на машынах распушчаюцца ў велізарных масівах бяз знаку. Чарніцы ды журнавіны тут зьбіраюць у прамысловых маштабах; вядро брусьніцаў можна набраць проста

## ХРОНІКА

**14 жніўня**

З актывістам АГП **Маратам Афанасьевым** з Жлобіна не прадоўжылі працоўнага кантракту: ён 20 гадоў адпрацаваў на Беларускім мэталюргічным заводзе. Звальненьне адбылося ў дзень нараджэньня актывіста. Ён дэпутат, і звальненьне трэба ўзгадняць з гарсаветам, чаго не рабілася.

**Пратэстанцкая царква «Новае жыцьцё»** падала апэляцыю ў Гаспадарчы суд Менску, патрабуючы пакінуць ёй будынак.

**15 жніўня**

Дырэктар Магілёўскага заводу штучнага валакна адмовіўся сустракацца з кіраўніцтвам **прафсаюзу РЭП**, каб вырашыць праблему прафсаюзу на прадпрыемстве.

**16 жніўня**

У Горадні рэдактара часопісу «Magazyn Polski na uchodzstwie» **Андрэя Пачобута** выклікалі на допыт у міліцыю. Сьледчага Ленінскага РУУС цікавіла, хто фінансуе выданьне і ці атрымліваў журналіст грошы ад польскіх калег, каб сплаціць леташні штраф 2500 даляраў за несанкцыяваны пікет. 18 жніўня актывістаў Саюзу палякаў А.Пачобута, **Мечыслава Яскевіча** і **Ігара Банцара** затрымалі, зьвінавацiўшы, што яны замінялі здымкам дзяржаўных журналістаў. Каб сарваць паседжаньне Рады СПБ, прызначанае на 19 жніўня, ДАІ некалькі разоў спыняла машыну **Віктара Мацулевіча**, які ехаў з Браслава. У Мазыры **Майну Шмаргун** выклікалі на 19-га «для размовы» ў КДБ. А ў Навагрудку **Вайцеха Барадзіна** тэрмінова выклікалі ў ДАІ для праверкі дакумэнтаў на аўтамабіль.

Адміністрацыя бабруйскага заводу «Беларусь» адмовілася распаўсюджваць дзеяньне калектыўнай дамовы на **сяброў Беларускага незалежнага прафсаюзу** і ня выплаціла ім 75% прыбаўкі да адпачынку на аздараўленьне, парушыўшы Працоўны кодэкс.

Падатковая інспэкцыя Магілёва аштрафавала на 4 базавыя велічыні актывіста ПКБ прафэсара **Валера Беразіенку** за тое, што на партыйнай сядзібе няма кнігі заўваг і прапановаў. Яшчэ аднаго актывіста ПКБ **Валер'я Заўялава** аштрафавалі на 10 б.в. за збор складак паводле састарэлых ведамасьцяў.

Недзяржаўная газэта з Баранавічаў **«Intex-press»** выйграла суд у дырэктара абутковай фабрыкі, які вінавацiў выданьне ў зьнявазе гонару і годнасьці.

На акцыі Дзень салідарнасьці ў Менску затрымалі **Аляксандра Спрагоўскага, Віталя Стажарава, Яўгена Навінскага,**

# сыходзяць у лес

каля сваёй хаты; у малінах раз-пораз бачаць мядзьведзя. Але, як павялося ў нас з калгасных часоў, дзе Божая шчодрасьць, там чалавечае марнатраўства. Што ягады, што грыбы, што кветкі — выбіраюць па-барбарску. Лісічкі грабуць з карэньнем ды мохам — каб ворагу нават грыбніцы не засталося. Тыя чарнічныя кусьцікі, якія жывуць да 300 гадоў і, можа, бачылі Касьцюшку ды паўстанцаў Каліноўскага, абскубаюць «машынкамі», а потым наракаюць: нешта ягада штогод драбнее...

Букецік веснавых пралесак ці ландышаў, за які ў Менску ахвотна аддадуць 1,5—3 тысячы, выдзіраецца дзе-небудзь на палянцы пад такім вось Сітнам; ахапкамі загружаюцца цэлыя мікрааўтобусы. Калі дарогаю ня сцапаюць полацкія «зялёныя», 300—400 «зялёных» амэрыканскіх гарантавана.

І ўсё ж самы выгадны бізнэс у Сітне-сіці — саленьне лісічак. Звычайна кошты на лісічку вагаюцца ад 3 да 8 тысячаў за кіляграм. Але калі іх не здаваць адразу, а саліць і прычакаць Калядаў — тады сюды заяжджаюць нямецкія нарыхтоўшчыкі — запасьлівы гаспадар можа атрымаць 10—15 эўра за кілё. Бывае, за сэзон сіценская сям'я зьбярэ да тоны лісічак. Вось і лічыце.

Адзінае зьдзіўляе: як толькі людзі прымудраюцца прапіваць такую прорву грошай?

Хто ж зарабляе на сіценскіх грыбах, ягадах? У першую чаргу — скупшчыкі. Аб'яднаныя ў канкурэнтныя сеткі (прыватная фірма з Расонаў, Полацкая райспажыўкаапэрацыя, «гастралёры» з Расеі, мясцовыя нелегальныя гандляры, якія разам зь ягадамі займаюцца адначасна і цыгарэтамі, і алькаголем), яны выграбаюць тутэйшае багацьце, зазвычай мінаючы дзяржаўны бюджэт. У разгар сэзону адно толькі Сітна здае больш за тону чарніцаў штодня, Алёшча — паўтоны. А гэта ж толькі чарніцы. Толькі трацiна сельсавету. А сельсаветаў у нас у Беларусі болей за тры тысячы...

Гэта на першы погляд можа падацца, што ягадна-грыбная тэма — так, летняя забаўка. Насамрэч зьбіраньне грыбоў ды ягадаў — канкурэнтная перавага Беларусі перад суседзямі ды важкі артыкул даходу для мясцовага бюджэту з эўрапейскім самакіраваньнем. Калі 15—20% прыбытку скупшчыкаў пералічваць у сіценскую ўправу — будуць сродкі і на экалёгію, і на разьвіцьцё.

...Вы спытаеце, якая ж высокая мараль можа высноўвацца з такое прыземленае, нават *падножнае* тэмы?

Ашчаджаць дар тварэньня, даручаны нам разам зь зямлёю, і бачыць Боскі цуд у звыклым, чаго не заўважаем, чым грэбуем, — адна з самых яскравых прыкметаў нацыянальнага абуджэньня.

*в.Малое Сітна*

Самы выгадны бізнэс у Сітне-сіці — саленьне лісічак.

## ХРОНІКА

апранутых у майкі з патрэтамі зьніклых, і яшчэ 7 чалавек. У пастарунку міліцыянты сьпярша склалі рапарты пра «несанкцыяваны сход», а потым адпусьцілі маладых людзей без пратаколаў.

У Гомелі на флэш-мобе «для высьвятленьня асобаў» затрымалі **каля 10 юнакоў**: іх зьнялі на відэакамэру і адпусьцілі без пратаколаў.

Падчас флэш-мобу на Дні салідарнасьці ў Магілёве затрымалі **10 чалавек** — «для высьвятленьня асобаў». Пасьля акцыі падчас распаўсюду незалежнай прэсы затрымалі **Сержука Нягаціна.**

### 17 жніўня

У Гомелі з ініцыятывы адміністрацыі чыноўнікі Мін'юсту забаранілі **суполку прафсаюзу РЭП** у аўтобусным парку №1.

Вярхоўны суд не задаволіў касацыйнай скаргі **ГА «Інавацыйны фонд прававых тэхналёгіяў»**, афіцыйна скасаваўшы арганізацыю.

### 18 жніўня

Актывісты прафсаюзу РЭП **Уладзімер Тузаў** і **Галіна Драздова** выйгралі суд у Магілёўскага заводу штучнага валакна: з звольненымі яшчэ ўвесну актывістамі не разьлічыліся цалкам, а Тузаву яшчэ і не адразу аддалі працоўную кніжку.

### 20 жніўня

У Мядзелі актывіста АГП **Андрэя Абалевіча** выклікалі на допыт у міліцыю: даставіў яго начальнік раённага крымінальнага вышуку. Актывіста хацелі зьвінаваціць, што ён зрабіў «антыдзяржаўныя» графіці «Дастаў» і «Надакучыў».

### 21 жніўня

На волю выйшлі актывісты «Партнэрства» **Эніра Браніцкая** і **Аляксандар Шалайка**.

Стала вядома, што яшчэ 3 жніўня Вярхоўны суд ліквідаваў **ГА «Беларускія фабрыкі думак»**. Паседжаньне адбылося пры адсутнасьці адказчыка.

У Берасьцейскім раёне каля Страдзічаў міліцыянты затрымалі аўтобус з 26 маладымі сацыял-дэмакратамі, якія ехалі на летнік ва Ўкраіну. Пасьляператрусу і асабістага нагляду маладых людзей адпусьцілі, а аўтобус затрымалі як «тэхнічна няспраўны».

На беларуска-польскай мяжы затрымалі аўтамабіль актывіста БСДП (Г) **Алега Воўчака**: у яго канфіскавалі кнігу пра Юр'я Захаранку і кнігі «Выбары прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі ў 2006 годзе. Факты. Камэнтары».

**АШ**



# Як лапцем па балоце

Калі б рэфэрэндум сапраўды стаяў на парадку дня, пра яго паведаміла б аўтарытэтнейшая крыніца. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Пасьля хуткацечнай сустрэчы Пуціна з Лукашэнкам у Сочы пайшла новая хваля размоў пра немінучы рэфэрэндум па канстытуцыйным акце. Але хто яе пагнаў? Бульварная расейская газэта «Жизнь», спаслаўшыся на Івана Макушка — прэсавага сакратара Паўла Барадзіна. Што адзін, што другі пэрыядычна абвяшчаюць нешта падобнае, нібы лапцем па балоце ляпаючы.

«Рэфэрэндум сёлета малаімаверны, — кажа палітоляг Андрэй Фёдараў. — Паведамленьне жоўтай газэты не падобнае на пачатак прадуманай піяр-кампаніі». Сапраўды, калі б рэфэрэндум стаяў на парадку дня, пра яго хіба паведаміла б аўтарытэтнейшая крыніца. Напрыклад, фірмавы жанр, — «крыніца ў Крамлі».

У сьціслыя тэрміны плебісцыт цяжка арганізаваць нават тэхнічна, бо ёсьць жа пэўная працэдура. Бакі мусяць ухваліць праект на супольным дзяржсавеце. Пакуль жа не чутно нават пра тое, што розныя варыянты зьведзеныя ў нешта адно.

Галоўнае ж, на думку Андрэя Фёдарава, тое, што ў беларускага боку яшчэ не такія слабыя пазыцыі, каб падымаць рукі ўгору. Ёсьць сама мала два козыры: транзыт і вайсковыя базы. Плюс такая нібыта эфэмэрная, але грозная зброя, як рыторыка. Справакаваць антыкрамлёўскую кампанію зь Менску, атрымаць абвінавачаньні ў канчатковым пахаваньні братняй інтэграцыі — гэта Маскве было б надта недарэчы перад сваімі думскімі, а потым і прэзыдэнцкімі выбарамі.

А ўявеце сабе такі фінт вушамі: Менск пад пугай згаджаецца на плебісцыт — і з трэскам яго правальвае. Такіх udараў вялікія маскоўскія камбінатары ня зьведвалі даўно...

Зрэшты, сярод крамлёўскіх дарадцаў пэўна ж ёсьць цьвярозыя галовы, што кажуць: кіньце, хлопцы, дурное! Якое, да д'ябла, зьбіраньне земляў — тут бы ўтрымацца ў сёньняшніх межах... А Захад, вы думаеце, так і кінецца прызнаваць анэксію?

Што ж да сустрэчы тэт-а-тэт у «Бачаравым ручаі», то экспэрты схільныя лічыць, што бакі не паразумеліся. Газавае пытаньне адсунутае бліжэй да канца году, мяркуюць эканамісты Валер Дашкевіч і Яраслаў Раманчук. Зь іншага боку, гэта пацьвердзіў пасол у Маскве Васіль Даўгалёў, які заявіў, што цэны на газ будуць абмяркоўвацца ў кастрычніку-лістападзе.

Тым часам іншыя аналітыкі зважаюць на тое, што наш урад фактычна пачаў капаць акопы газавай вайны. Прымаюцца рашэньні, звышзадача якіх — паразімаваць, не акалеўшы. Дый маральна народ ужо рыхтуюць. Наўрад ці віцэ-прэм'ер Уладзімер Сямашка толькі зь любові да чыстай тэорыі стаў публічна развважаць на выбухованебясьпечную тэму падвышэньня камунальных тарыфаў на $32—35 пры некалі абяцаных $4—5 на год.

Карацей, насоўваецца суровая для ўсіх зіма.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У Івенцы захоўваюць традыцыі знакамітага мясцовага ганч... фэстываль «Гліняны звон».**



чарства. У суботу-нядзелю тут прайшоў

# Як гандляваць людзьмі па-патрыятычнаму



Галоўнае рэзюмэ скандалу вакол дзяўчынкі, якую ў Берасьці ў адной моладзевай патрыятычнай арганізацыі фактычна «прадалі» ў Анапу: не навучыліся мы яшчэ гандляваць людзьмі па-патрыятычнаму. У ідэале трэба так. Фэльетон **Лёліка Ушкіна.**

### Офіс РСМБ

Кліент: Добры дзень! Тут прадаецца жывая славянская шафа? Я не памыліўся з паролем?

Апаратчык: Усё правільна. Вы прыехалі ад Івана Іванавіча, нашага даўняга кліента з Анапы?

Кліент: Так! Ён мне распавядаў пра вас столькі добрага...

Апаратчык: Як кажуць, шмат працуем, мала сьпім, намагаемся стварыць моду на патрыятызм.

Кліент: Я вырашыў зьвярнуцца да вас па той самай праблеме. Я — дырэктар Мужчынскага клюбу, і мне патрэбныя стрыптызэршы.

Апаратчык: Вы памыліліся дзьвярыма. Гэта не прытон «коза-ностры», а служба працаўладкаваньня моладзі пры Саюзе патрыятычнай моладзі. Ніякіх стрыптызэршаў у нас няма.

Кліент: А хто ёсьць?

Апаратчык: Выхаванкі харэаграфічных гурткоў пры структурах РСМБ, чыя творчасьць — жывая ілюстрацыя пасьлядоўнай працы дзяржавы з таленавітай моладзьдзю.

Кліент: О! Бяру пяць штук. Будуць у мяне гэтую палітыку на сталах у адных купальніках пасьлядоўна ілюстраваць.

Апаратчык: Чакайце. Адной з умоваў кантракту будзе ўключэньне ў рэпэртуар музычна-харэаграфічных нумароў, якія будуць уздымаць патрыятычны дух камбайнэраў у часе ўборачнай.

Кліент: Можна паглядзець аркуш? «Квітней, Беларусь»? «Слухай бацьку», ОК! Колькі я вам вінны?

Апаратчык: Пачакайце, у нас вельмі-вельмі таленавітая моладзь, і я ўпэўнены, што нехта з наведнікаў Клюбу пажадае ў больш інтымнай атмасфэры ацаніць прыгажосьць духоўна-маральнага сьвету пасланіц нашай рэспублікі.

Кліент: Натуральна!

Апаратчык: Дык вось, каб сярод гэтых аматараў духоўнасьці не было дыпляматаў Латвіі і Чэхіі. Мы не дазволім ніякай галубізны.

Кліент: Гарантую.

Апаратчык: Цяпер скажыце: дзе будуць жыць танцоркі?

Кліент: У іх будзе свая камфартабэльная студыя, былая кладоўка памерам тры на тры.

Апаратчык: Яшчэ адна ўмова: на сьценах мусяць вісець партрэт, «капуста» і сьцяг. У нас ёсьць сымбалі, якімі трэба ганарыцца! І ня думайце проста выразаць «бацьку» з газэты. Набудзьце стандартнага, мэтар на два ў рамачцы.

Кліент: Гэта ўсё?

Апаратчык: Амаль. На ўвесь пэрыяд працы ў вас дзяўчаты павінны выпісаць «СаўБелію». І амаль забыўся — вітаньні Іван Іванавічу.

Кліент (сыходзячы): ...ня брэшуць беларускія білборды: «За апошняе стагодзьдзе рабства ня стала гуманьнейшым ні на ёту».

# Хто Народны?

Працяг. Пачатак у №№29-30.

## Вольскі

**Вашае пытаньне «Хто Народны?» прымусіла досыць падумаць. І не таму, што людзей, якія вартыя гэтага званьня, няма, а наадварот таму, што ў галаве адразу ўзьнікаюць розныя прозьвішчы: У.Арлоў, А.Федарэнка, М.Анемпадыстаў...**

Разважала я ў тым напрамку, што Народны мусіць быць ня проста пісьменьнікам, але перш за ўсё аўтарытэтам сярод грамадзян, мець цьвёрдыя грамадзянскія перакананьні.

Разважаючы такім чынам, я прыйшла да высновы, што гэтага званьня годны рок-музыка і літаратар Лявон Вольскі. Дзякуючы творчасьці гэтага чалавека, беларуская моладзь пачала вяртацца да свае мовы, паважаць і любіць яе, размаўляць на ёй.

Яго песьні ва ўмовах аўтарытарызму — глыток сьвежага паветра, які натхняе на змагарства за свабоду і за Бацькаўшчыну.

Галасую за Лявона Вольскага.

**Г. зь Менску**

## Анемпадыстаў

**«Хто Народны?» Пытаньне, дарэчы, цяжкае, бо прэтэндэнтамі Радзіма багатая.**

Хацелася б прапанаваць спадара Міхала Анемпадыстава, бо ягоныя вершы — адлюстраваньне ягонай адданасьці Беларусі, а сапраўдны Народны пісьменьнік перш за ўсё павінен быць адданым Бацькаўшчыне.

Далей тое, што спадар Анемпадыстаў піша вершы ў выглядзе тэкстаў для рок-музыкі, надае ягонай творчасьці значнасьць у пляне ўплыву на настрой моладзі й грамадзтва ўвогуле. Рок — сацыяльная зьява, асабліва ў межах нашае рэчаіснасьці, і сучасная паэзія наагул, на маю сьціплую думку, набывае сацыяльную вастрыню менавіта ў выглядзе рок-тэкстаў.

Таксама няможна не адзначыць ягоны ўнёсак уаднаўленьне нашае роднае мовы.

**Кася зь Менску**

## Хай выбіраюць самі Народныя

**Пытаньне пра спадкаемства ў шэразе Народных пісьменьнікаў Беларусі паўстае своечасова. У час этнацыду, калі ўсё, што сьведчыць пра багатую культуру ды гісторыю нашага краю, нішчыцца мэтанакіравана, як ніколі патрэбны тыя людзі, тыя сымбалі, вакол якіх можа яднацца ўсё, што зьвязана зь беларускасьцю.**

Як пазначыў у сваім артыкуле Віталь Сіліцкі, непалітычнае дэмакратычнае змаганьне, пошук шляхоў існаваньня ў свабодзе і пашырэньне тэрыторыі вольнага грамадзтва ў паняволенай краіне — адзіная магчымасьць вытрываць для беларускай грамадзянскай супольнасьці.

Вышэйпазначанае мае дачыненьне да пытаньня пра тое, ці ёсьць сэнс у вызначэньні новых Народных пісьменьнікаў. Калі гэтую ідэю задушыць цяпер, то гэта будзе найвялікшай несправядлівасьцю ў адносінах да беларускае культуры.

Што да мэханізму вылучэньня новых Народных пісьменьнікаў, то існуюць тры патэнцыяльныя варыянты. Зь іх найбольш прыдатны — вызначэньне новых Народных пісьменьнікаў тымі, хто ўжо мае гэты ганаровы тытул. Каб быць больш пераканаўчым, прапаную каротка агледзець кожны з трох магчымых шляхоў.

Першы — вызначэньне Народных пісьменьнікаў народам праз сваіх паўнамоцных прадстаўнікоў.

Гэта найгоршы варыянт, улічваючы сучасны стан грамадзтва.

Другі шлях — вызначэньне Народных аўтарытэтнай установай накшталт Саюзу пісьменьнікаў ці ПЭН-Цэнтру.

Таксама не найлепшы варыянт. Па-першае, кожная з прапанаваных установаў ня вельмі вядомая шырокаму грамадзтву і, верагодна, ня мае дастатковага аўтарытэту, каб узнагароджваць такім высокім тытулам. А па-другое, улічваючы абставіны, нельга заручыцца, што такая ўстанова, дзякуючы клопату Мін'юсту, ня зьнікне праз пэўны час ці не ператворыцца ў чарговы заапарк (стварэньне прапрэзыдэнцкага Саюзу пісьменьнікаў — ці не найлепшы таму прыклад). Да таго ж можа здарыцца, што некалькі структур «не падзеляць» права на вылучэньне Народных пісьменьнікаў, і ўсё скончыцца фарсам.

Трэці і найлепшы шлях — вызначэньне новых Народных пісьменьнікаў «старымі» Народнымі пісьменьнікамі.

З усіх цяпер жывых беларусаў толькі тыя людзі, што зьяўляюцца Народнымі пісьменьнікамі, маюць маральнае права ўзнагароджваць іншых такім ганаровым тытулам ці вырашаць, што такое ўзнагароджваньне не патрэбна наагул. Хто пасьля дазволіць сабе заявіць, што Барадулін ці Гілевіч памыліліся ў вызначэньні таго ці іншага на гэту пасаду?

Але пры вылучэньні НАРОДНАГА пісьменьніка нельга не зьвярнуць увагі на меркаваньне НАРОДУ. Варта будзе арганізаваць плойму інтэрнэт- (і ня толькі) апытанак, грамадзкіх абмеркаваньняў, запытаць меркаваньне пісьменьнікаў, журналістаў, вядомых людзей краіны. Можна таксама прапанаваць выказаць свае меркаваньні і адпаведным установам, напрыклад, ТБМ ці Радзе БНР, палітычным партыям і (хіба ў будучыні. — **Рэд.**) дзяржаўным установам. Менавіта ў арганізацыі шырокага грамадзкага абмеркаваньня мусяць прыняць удзел такія установы, як БАЖ і г.д. Пасьля ўвесь гэты аб'ём інфармацыі мае быць перададзены Народным пісьменьнікам, якія будуць паводле свайго жаданьня ўлічваць і выкарыстоўваць яго пры прыняцьці рашэньня.

Гэтакая даволі складаная кампанія ў вылучэньні новых Народных пісьменьнікаў будзе служыць наступным мэтам: яна дасьць магчымасьць меркаваньню грамадзтва ўплываць на рашэньні камісіі Народных пісьменьнікаў; чым больш грамадзтва будзе ўцягнута ў працэс вылучэньня, тым больш рашэньне камісіі будзе вядомае і легітымнае; трэба, каб ня менш за 15—20 адсоткаў беларускага грамадзтва ведала, што нейкае вылучэньне адбылося; акрамя таго, такі даволі працяглы працэс вылучэньня не спародзіць дзесяткаў нававылучаных пісьменьнікаў і не дэвальвуе гэты тытул.

Калі большасьць пагодзіцца з маёй прапановай, то трэба ўсьведамляць, што Народных пісьменьнікаў засталося вельмі няшмат, і калі мы хочам выкарыстаць найбольш прыдатны трэці шлях, а менавіта вырашэньне пытаньня Народнымі пісьменьнікамі, то трэба пачынаць працу ў гэтым напрамку, бо калі адкласьці яе гадоў на дзесяць, можа быць ужо позна.

**Міхась Чыгунок, Менск**

***

На маю думку, званьня народнага вартыя наступныя творцы: Г.Бураўкін, В.Іпатава, У.Арлоў, А.Разанаў, В.Казько, У.Някляеў, С.Законьнікаў.

**Сяргей з gmail.com**

Анансаваны ў мінулым нумары адказ А.Дынька С.Навумчыку й В.Тарасу выйдзе ў наступным нумары «НН».

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

## Стыпэндыі Каліноўскага толькі завочна

**Стыпэндыя Каліноўскага як зьява — рэч, безумоўна, неабходная.** Але ёсьць прынцыповыя моманты.

1. Усе стыпэндыянты павінны навучацца завочна і працягваць жыць у Беларусі. Выняткам тут могуць быць тыя асобы, якія перасьледуюцца ў Беларусі (маецца на ўвазе крымінальны перасьлед, а не ўхіленьне ад войска).

2. Мусіць быць створана грамадзкая камісія з прадстаўнікоў буйных няўрадавых арганізацыяў і палітычных партыяў, якая б кантралявала дзейнасьць Камітэту абароны рэпрэсаваных. Такім чынам можна было б значна звузіць поле для спэкуляцыяў са стыпэндыяй.

Я разумею, што завочнае навучаньне значна адрозьніваецца ад дзённага навучаньня, але, тым ня менш гэта мусіць быць прынцыповым рашэньнем. Зрэшты, калі так шмат рэпрэсаваных, якія ня могуць навучацца ў Беларусі, можна было б арганізаваць адмысловую форму навучаньня. Напрыклад, ня дзьве, а чатыры выязныя сэсіі. Начытку лекцыяў і кансультацыі можна было б арганізаваць і ў Менску. Да гэтай справы можна было б прыцягнуць звольненых выкладчыкаў.

Да тых краінаў, якія згадзіліся дапамагаць рэпрэсаваным беларусам, трэба было б зьвярнуцца з такой прапановай і паспрабаваць сканцэнтраваць усе высілкі, а не «расьцягваць» па дзесяць студэнтаў у кожную зь іх.

Бо інакш зьменаў мы можам так і не дачакацца, калі ўсіх, хто пад ціскам, будзем вывозіць з краіны.

**Сяржук Семянюк, Менск**

## Міра́, мірскога

**Спадару Харэўскі, з болем прачытаў Ваш артыкул у «НН» ад 11 жніўня «Там возера Сьвіцязь...».** Вы добра ўсё заўважылі і правільна напісалі. Але мне, чалавеку мірско́му хочацца зрабіць адну заўвагу. Я даўно ваюю за правільнае ўжываньне-скланеньне слоў Мір і мірскі́, бо лічу, што воблік слова адлюстроўвае яго гісторыю і яе нельга фальшаваць, як і архітэктурны воблік паселішча. Я неадноўчы пісаў на гэту тэму (у «ЛіМе», у «Звяздзе», калі інтэнсіўна рабілі муляж з гэтага слаўнага мястэчка. Хацеў я вярнуць назву асноўных вуліц: Мíранская, Віленская, Татарская і інш.). Не ўдалося! Там я закранаў і воблік слоў. Марна! Нават адраджэнцы мяне не падтрымалі.

Калі Вам давядзецца пісаць яшчэ пра Мір, мне хацелася б, каб вы правільна, г.зн. як спакон веку самі жыхары-«туземцы» скланялі, пісалі канчаткі і Міра́ і мірско́га. У Вас «Усе дарогі Міру́». Не, фальш! Трэба: Мір, мірскі́ (чалавек, замак), Міру́ (надалі), мірско́му, за Міро́м, мірскі́м, ў Міры́ (як «двор» скланяецца зь пераносам націску).

У канцах прашу, каб Вы, будучы там, прыслухаліся да пажылых аўтахтонаў.

**І.Крамко, Менск**

## Зажлукціўся ў калодзежы

**У Дуброве 3 дні таму зажлукціўся ў старым калодзежы мужчына нестарога веку.** Ішоў позна ўвечары на добрым падпітку. Мо сеў на край бэтоннага колца закурыць ды й курдануўся унутр. Праз два дні знайшлі нежывога.

Быў ён добры гарманіст, у калгасе пасьвіў каровы. З-за пераламанай нагі апошні час быў на бюлетэні. Як кажуць, лёс...

**Мікола Бусел, Дуброва**

## Падпішуся так, як мяне ніколі не назавуць

**Дасылаю разважаньні пра самую неабходную рэч для ўсталяваньня ў краіне добрага інвэстыцыйнага клімату. Частка тэксту напісана на палескай гаворцы. Як памяць пра дзеда...**

*Колі ховалы мойго діда, муй дядько, чоловік надто роботяшчы, але й трохі завыдны, сказаў прозь сьлёзы: «Мусыть, другого такого хозяіна ў сэлі нэма...»*

*Дідовы рукі нэ відалі покою з ранку до самого заходу сонця, а посьле, повэчэраўшы, дід молыўся і просыў погоды на заўтра, коб можна було добрэ поробыты...*

*Дід вірыў у Бога — і тому мэняўся з сусідямы чэрэдом — і ў нэділю ходыў за коровамы. У нас так і кажуть — нэ «пасты коровы», а «ходыты за коровамы». Робыты ў нэділю нэ можна, а ходыты Бог нэ забороняе.*

*Оно ў вэлікія святы я бачыў дідуся сэдячым на лаўцы коло хаты. У одын з такіх дней я й поспробоваў роспросыты тое, шчо ўжо даўно хотілося знаты: «Діду, а чому тюткі ў аўтобусу казалі, шчо я йіду до Падя Мостыського? Нэўжэ мы Мостыські?» Дід ныц нэ сказаў...*

*Ужо колы я вучыўся ў Універсітэті, росказалі. Мостамы ніколі зваўся хутор нэдалёко сэла. Наш хутор.*

*Восем годоў дідоў батько робыў докером у Балтыморскому порті, собраў грошы, вэрнуўся — і купыў 45 гектароў зэмлі. Росьлі чотыры сыны.*

*У Мостах быў вэлікі сад. А в 1950-му шэстігодова діўчынка (моя мама) просыла ў сусідкі яблыко, коб на смак його попробоваты... Хутор забралі ў 1946-м, сад зоралі ў 1960-е. Зэмлю забралі, осталаса оно прывычка до роботы.*

*Колі дід попаў до сватоў на далёку Ўкрайну, то ўсі дні ходыў і цокаў языком: «Ох, коб нам таку богату зэмлю...» Мрію про зэмлю дід дэржаў у сэрцы. Участок коло хаты кожны год пошыраўса: з одного боку ліс, з другого — колхознэ поле... Але тяжка робота зробыла свою справу...*

*Я знаю: самэ страшнэ ў жытті — бэсьсільле... По нэпоголеных шчоках діда котыцца сьлёза ў Бороўлянской рэанімацыі, одныммы губамы просыть «воды» — і плачэ од розуміньня, шчо ўжэ нэ здужае робыты, як раній...»*

Я стаяў на вуліцы ў Балтыморы і раптам зразумеў: у мяне будзе сын, і яго будуць зваць, як майго прадзеда, — Кірылам. Можа, хоць ён дачакаецца, калі наша ўлада без аніякіх апытаньняў народу наконт мэтазгоднасьці такога кроку (няўжо трэба пытацца ў крэдытора — а ці трэба аддаваць яму запазычанасьць?) прыме Закон аб рэстытуцыі і ўсталюе нармальную прыватную ўласнасьць на зямлю? У памяць тых, у каго некалі адабралі ўсё, акрамя звыкласьці працаваць. У памяць майго дзеда...

І няхай ніхто не спрабуе левым вокам задацца пытаньнем: «А што вы будзеце рабіць з гэтай зямлёй?» Гэта мая зямля. Што хачу — тое і буду.

Хочацца падпісацца так, як мяне ніколі не назавуць —

**Санё Мостыські, tut.by**

## Рэкорды жніва

U «NN» № 28 u artykule «Rekordy žniva» byli dadzenyja niavernyja fakty što da Mahiloŭščyny — albo jich atrymali ź niedaśviedčanych krynicaŭ, albo jany sastareli na 4—5 hadoŭ. Spadar Piečanko piša, što sioleta plan Mahiloŭščyny 850 tys. ton, hoć nasamreč 970 tys. ton musiać sabrać haspadarki, a 1 200 000 — usia vobłaść, razam z fermerami. A zapavietny miljon Mahiloŭščyna źbirała i ŭ 2004-m, i ŭ minułym. Što praŭda, u 2004-m nadałosia cudoŭnae nadvorje dla žniva, a lataś praz nadvorje byŭ niedarob, tak što chitryli jak maha. Kažuć, mała što prypisvali, dyk sabraŭšy krychu bolej za 900 tys. ton, astatnija dzeła spravazdačnaści ciškom zakupali ŭ Rasieji. Ale hetaha ciaper nie dakažaš.

Naahuł, paraŭnoŭvać Mahiloŭščynu i Homielščynu niasłušna. Zusim jinšy klimat. Klimat navat pamiž Bychaŭščynaj i Škłoŭščynaj taki rozny, što jinšyja namałoty, tempy, terminy ŭborki. Prosta časam my jašče pa zaviadzioncy ličym Biełaruś maleńkaj, kampaktnaj, małaadroznaj unutry siabie.

**Alaksiej Baciukou, Mahiloŭ**

**Ад аўтара.** Мой сябар паводле службовых абавязкаў штотыдзень бывае на плянэрках аднаго з райвыканкамаў. Зьбіраючыся на чарговую, пачуў па радыё навіну пра хуткае завяршэньне жніва ў ягоным рэгіёне і пераход тэхнікі адсталым гаспадаркам. Але на нарадзе старшыня райвыканкаму здушаным голасам паведаміў прысутным, што з-за кепскага надвор'я на дадзены момант сабрана зерня з 16 % уборачнай плошчы. Ні пра які пераход тэхнікі гаворка не вялася.

Паказчыкі я атрымаў ад людзей, што валодаюць менавіта такімі зьвесткамі, пра якія ня хваляцца па радыё. Іншая рэч, што такія лічбы таксама ня могуць выклікаць поўнага даверу. Сытуацыя зь сельскагаспадарчай статыстыкай нагадвае агучваньне вынікаў беларускіх выбараў — часам нават тыя, хто мае доступ да інфармацыі, не валодаюць ёю ў поўнай ступені ці ня могуць яе агучыць.

Параўноўваючы Магілёўскую і Гомельскую вобласьці, я закранаў не агракліматычныя ўмовы гаспадараньня, а рознае стаўленьне да гэтых рэгіёнаў з боку ўладаў. Разумны гаспадар укладае сродкі ў тое, што дасьць найбольшы плён. А так Гомельшчыне папросту не пашанцавала быць радзімай прэзыдэнта. Таму яна і купляе сьпісаныя за непатрэбнасьцю старыя «Доны» ў суседзяў, маючы «Гомсельмаш».

**Сямён Печанко**

# Яшчэ пра Росіцу, марыянаў, грэка-каталікоў і кроў

**У «НН» №30 ад 18 жніўня прачытаў артыкул «Пілігрымка ў Росіцу» аўтарства Кастуся Шыталя з Докшыцаў. Добра, што друкуеце матэрыялы пра падзеі рэлігійнага жыцьця ў Беларусі, бо беларусам сёньня яўна не хапае веры ў сябе і салідарнасьці. Аднак у гэтым артыкуле ёсьць пэўная недаказанасьць. Аўтар чамусьці цалкам праігнараваў удзел у гэтым сьвяце грэка-каталікоў: сьвятароў, сэмінарыстаў, вернікаў. Іх, дарэчы, на ўрачыстасьцях было больш за два дзясяткі. Грэка-каталіцкія пілігрымы прыехалі зь Менску, Полацку, Воршы, Барысава, Горадні, Берасьця, Івацэвічаў...**



Мо аўтар палічыў, што дастаткова згадкі пра прээзентацыю новай кнігі Рыгора Барадуліна «Рымскі дыпціх» і ўдзел у сьвяце барда Алеся Камоцкага, бо дзядзька Рыгор і А.Камоцкі — вернікі Беларускай Грэка–Каталіцкай Царквы? Але ж К.Шыталь ні словам не ўзгадаў пра гэта. Як і пра тое, што да арганізацыі гэтай літаратурна–музычнай імпрэзы падчас росіцкіх урачыстасьцяў спрычыніліся беларускія грэка–каталікі, а кнігу з гэтым новым творам Р.Барадуліна выдала грэка–каталіцкая парафія Сьвятапакутніка Язафата ў Полацку. Урэшце, дапускаю, што ўсяго гэтага К.Шыталь ня ведаў.

Толькі ж дзіўна тады, як жа наш брат не заўважыў у праграме сьвята і не пачуў за гадзіну да апоўначы 11 жніўня малітвы–акафісту да Маці Божай, які сьпявалі грэка–каталікі. Не заўважыў ён таксама падчас урачыстай лацінскай імшы, якую апоўначы служыў віцебскі ўладыка У.Блін, што разам маліліся ня толькі лацінскія сьвятары, але й пяць сьвятароў бізантыйскага абраду з дыяканам ды яшчэ таксама і армяна–каталіцкі сьвятар. Хіба часта ў нас у Беларусі можна патрапіць на набажэнства, дзе разам моляцца каталікі адразу трох розных абрадаў: лацінскага і двух усходніх — беларуска–бізантыйскага і армянскага?! Пэўна, ранкам, 12 жніўня, а 8–й гадзіне аўтар артыкулу таксама яшчэ спаў, калі была адслужана ўсходняя літургія з удзелам шматлікіх пілігрымаў і мясцовых вернікаў...

Гэтыя ўрачыстасьці ў памяць закатаваных фашыстамі Росіцкіх мучанікаў сталі выдатнай нагодай, каб яскрава выявіць праўдзівую сутнасьць Каталіцкай Царквы — паўсюднасьць і еднасьць у разнастайнасьці абрадаў і народаў. На жаль, гэты асаблівы характар урачыстасьцяў застаўся абсалютна па–за ўвагай К.Шыталя ў яго допісе. Склалася ўражаньне, што аўтар, як і шмат хто, у лепшым выпадку памылкова атаясамлівае Каталіцкую Царкву выключна з Рыма–Каталіцкім Касьцёлам, г.зн. з адным лацінскім абрадам (якіх у Каталіцкай Царкве насамрэч паўтара дзясятка), падобна як тыя ня вельмі адукаваныя людзі ўсіх каталікоў запісваюць у палякі. Ня хочацца думаць, што тут мела месца сьвядомае ігнараваньне беларускіх грэка–каталікоў, маўляў, што там пісаць пра гэтых нейкіх незразумелых ці то праваслаўных, ці то каталікоў. Між тым, прысутнасьць сьвятароў і вернікаў усходняга абраду ў Росіцы, у мясьцінах, дзе працавалі на місіях друйскія марыяне, якія так марылі служыць для адраджэньня Уніі ў Беларусі, зусім не выпадковая.

Блаславёны мучанік Юры Кашыра быў ахрышчаны паводле бізантыйскай традыцыі, бо паходзіў з праваслаўнай сям'і, дзе продкі былі ўніятамі. Маці яго, як і многія былыя ўніяты, як толькі гэта стала магчыма пасьля царскага ўказу пра верацярпімасьць, вярнулася ў Каталіцкую Царкву. Адно што мусіла прыняць лацінскі абрад, бо тая царская міласьць адраджэньня Уніі, г. зн. Каталіцкай Царквы бізантыйскага абраду, не дапускала... Сам жа Юры Кашыра ўжо ў сьвядомым узросьце (у 18 гадоў) стаў каталіком.

Блаславёныя росіцкія сьвятары ў час выпрабаваньня, перад абліччам нялюдзкасьці і фашыстоўскай нянавісьці далі сьвету сьведчаньне пастырскай адданасьці, мужнасьці, годнасьці і любові да бліжніх, добраахвотна разьдзяліўшы цярпеньні простых людзей (вернікаў як заходняй, так і ўсходняй традыцыі, як палякаў, так і беларусаў), прыняўшы разам зь імі мучаніцкую сьмерць. Вось жа дзіўна сёньня, у мірных умовах забываць на гэтае сьведчаньне любові і еднасьці, тым больш беларусам.

Варта таксама адзначыць яшчэ адзін факт, пра які не згадаў у сваім артыкуле Кастусь Шыталь: каб ушанаваць памяць беларускіх мучанікаў–марыянаў, з Рыму ў Росіцу прыбыў генэрал Ордэну марыянаў а. Ян Рокаш.

Асабіста мне сёлета ўпершыню здарылася патрапіць на ўрачыстасьці ў Росіцу з нагоды ўшанаваньня памяці блаславёных мучанікаў Юр'я Кашыры і Антона Ляшчэвіча, якія належалі да Друйскага кляштару марыянаў. Чытаючы гістарычныя і палемічныя матэрыялы пра Друйскі кляштар айцоў–марыянаў, які, па задуме блаславёнага біскупа Віленскага Юр'я Матулевіча ствараўся для душпастырскай працы сярод беларусаў, мне таксама хацелася даведацца, што ж цяпер у гэтых мясьцінах. Ці маюць рацыю тыя, хто скептычна ацэньвае плён працы беларускіх марыянаў, якіх польскія ўлады перад самай вайной гвалтоўна выселілі з Друі, а іншых адправілі на місію ў далёкі Харбін, што стала падставай, каб сьцьвярджаць, што ад беларускасьці ў гэтых мясьцінах ужо і духу няма. Ня ведаю, якія ўражаньні вынес для сябе зь сёлетніх урачыстасьцяў у Росіцы цяперашні зьверхнік Ордэну айцоў–марыянаў — паляк з нацыянальнасьці. Вайна і шматлікія людзкія ахвяры шмат зьмянілі ў гэтым краі, і мне здаецца, ачысьцілі сумныя старонкі беларуска–польскіх дачыненьняў. Вось жа кроў мучанікаў–марыянаў Юр'я Кашыры і Антона Ляшчэвіча не была праліта марна. Бо сёньня ў Росіцкім касьцёле пануе беларускі дух, сёньня тут гучыць літургічная малітва і рэлігійныя песьні выключна ў роднай мове, сюды прыходзяць і прыяжджаюць шматлікія пілігрымы з усяе Беларусі, якія ўзносяць малітвы падзякі за нашых мучанікаў у сваёй роднай беларускай мове. З прыемнасьцю для сябе заўважыў, што і ў часе начной працэсіі праз усю дарогу да месца мучаніцкай сьмерці блаславёных вернікі — як маладыя, так і старыя, маліліся ды сьпявалі розныя песьні выключна па–беларуску. Для мяне — ня дзіва! Бо працуюць тут ужо маладыя айцы–марыяне — шчырыя беларусы. Яны — тое зерне, што сеялі мужныя вызнаўцы веры: заснавальнік Друйскага кляштару архімандрыт Андрэй Цікота і архімандрыт Фабіян Абрантовіч, якія прынялі мучаніцкую сьмерць у савецкіх лягерах і за бэатыфікацыю якіх сёньня моляцца нашы вернікі.

Між іншым, цікава адзначыць, што армянска–каталіцкі сьвятар айцец Петрас (Эрнэст) Есаян, што браў удзел ва ўрачыстасьцях у Росіцы, — ураджэнец Беларусі, які служыць цяпер у Ераване — таксама выдатна валодае беларускай мовай і ў свой час праходзіў сьвятарскую фармацыю ў марыянаў...

**Ігар Бараноўскі, Берасьце**

# Таямніца «залатога запасу» БНП



АРХІЎ СЯРГЕЯ ЯРША

## Да 100-х угодкаў з Дня народзінаў **Юльяна Саковіча.**

Падчас нямецкай акупацыі 1941—1944 г. беларускі нацыянальны рух Супраціву выношваў пляны ўзьняцьця «незалежніцкага антынацысцкага паўстаньня», якія, аднак, не былі рэалізаваныя. Аўтарам першага пляну быў ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі. Сыход у лес нацыянальнага актыву, значнай часткі вайсковых і паліцыйных фармацыяў мусіў адбыцца вясной 1943-га. Аднак адбылася ўцечка інфармацыі, за некалькі месяцаў да гэтага Гадлеўскі быў расстраляны немцамі. Далей ідэю «незалежніцкага паўстаньня» спрабавалі рэалізаваць ягоныя бліжэйшыя паплечнікі Ўсевалад Родзька і Юльян Саковіч.

Былы камэндант менскай паліцыі, кіраўнік Беларускай Народнай Самапомачы Менскай акругі Саковіч пасьля пачатку паўстаньня мусіў заняць пасаду намесьніка Родзькі (кіраўніка паўстанцкіх сілаў). За кароткі час ён з дапамогай сваіх сяброў па КПЗБ і Грамадзе здолеў стварыць разгалінаваную падпольную сетку ў заходняй і цэнтральнай Беларусі. Летам 1942 г., падчас перамоваў Вінцэнта Гадлеўскага з прадстаўнікамі Масквы, каб прадэманстраваць саветам рэальную сілу беларускага падпольля, гэтая сетка арганізавала сэрыю дывэрсіяў і збройных антынямецкіх акцыяў.

Юльян Саковіч адказваў за ўзбраеньне беларускіх нелегальных групаў. Зброю здабывалі самымі рознымі спосабамі, але пераважна куплялі. На гэтыя мэты было вырашана накіраваць увесь «залаты запас» БНП. Вясной 1943 г. Саковіч атрымаў, праўдападобна, ад Усевалада Родзькі і перахоўваў мех залатых манэт. Ён прадчуваў сваю хуткую сьмерць, таму напярэдадні выезду на Лідчыну падзяліў золата на дзьве часткі. Іх ён перадаў двум праваслаўным сьвятарам, зь якімі быў добра знаёмы: Л. і К. Верагодна, абгаворвалася, што ў выпадку нейкага трагічнага здарэньня з Саковічам яны мусяць зьвязацца з пэўным чалавекам і вярнуць скарб.

13 чэрвеня 1943 г. у Васілішках на Лідчыне (цяпер Шчучынскі раён) невядомыя тэрарысты-палякі застрэлілі Юльяна Саковіча і Леаніда Маракова (апошні памёр на наступны дзень у лякарні).

«З боку нямецкіх спэцслужбаў у Беларусі акцыя супраць Саковіча не плянавалася», — сцьвярджае сёньня былы афіцэр СД. Аднак ён дапускае, што забойства ўчыніла польская нелегальная група, якая кантралявалася асобным аддзелам СД у Варшаве. Апошні меў свае мэты і не ўзгадняў акцыі з кіраўніцтвам СД у Беларусі.

Дарэчы, менавіта акоўцы неўзабаве забілі сьвятара Л., таму лёс часткі «залатога запасу» БНП, які ён перахоўваў, невядомы. Акоўцы спрабавалі забіць і жонку Саковіча. Сьвятар К. выжыў, ён зьмяніў месца жыхарства, купіў вялікі дом. Сям'я ягоная ня мела клопату — ніхто не патрабаваў вярнуць золата. Але страх, што некалі ўсё адкрыецца, ніколі не пакідаў К., аж да самай сьмерці.

**Сяргей Ёрш**

**Юльян Саковіч нарадзіўся 24 жніўня 1906 году ў фальварку Баўдыры каля Крэва. Сын заможнага земляроба, браў актыўны ўдзел у падпольнай Кампартыі Заходняй Беларусі, шмат гадоў правёў у польскіх турмах. Выпускнік Віленскай беларускай гімназіі. На пачатку нямецка-савецкай вайны выратаваўся з «калёны сьмерці» НКВД. Адзін з кіраўнікоў беларускага нацыянальнага руху Супраціву ў 1941—1943 гадах. Загінуў у 1943 годзе, пахаваны ў Лідзе.**

**КАЛЯНДАР**

## Верасень

**1** — 50 гадоў з дня нараджэньня сьпевака Ўладзімера Салодкага (1956) (ансамблі «Сьвята», «Вясельле»).

**3** — 275 гадоў з дня нараджэньня магілёўскага каталіцкага архібіскупа Станіслава Богуша-Сестранцэвіча (1731—1826), мітрапаліта ўсіх каталіцкіх касьцёлаў у Расейскай імпэрыі. Заснаваў Магілёўскую друкарню, напісаў дасьледаваньне па беларускай мове «Граматыка літоўская», шэраг гістарычных кніг. Дзядзька Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

**4** — 100 гадоў з дня нараджэньня Ігната Дуброўскага (1906), пісьменьніка, навукоўца ў сельскагаспадарчай галіне.

**7** — 75 гадоў з дня стварэньня панчошна-трыкатажнага прадпрыемства «КІМ» у Віцебску.

**10** — 75 гадоў з дня нараджэньня заслужанага трэнэра Беларусі й СССР Рэнальда Кныша (1931), выхавальніка алімпійскай чэмпіёнкі ў гімнастыцы Вольгі Корбут.

**14** (паводле старога стылю — **1**) — 100 гадоў таму ў Вільні выйшла першая легальная беларуская газэта «Наша Доля» (1906).

**16** — 75 гадоў з дня нараджэньня археоляга, дасьледчыка Берасьцейшчыны Пятра Лысенкі (1931).

**24** — пачатак Рамазану ў мусульманаў.

**27** — 100 гадоў з дня нараджэньня Народнай артысткі Беларусі Ірыны Ждановіч (1906—1994), «купалаўкі», дачкі Флярыяна Ждановіча. Акторскую дзейнасьць пачала яшчэ ў Першым беларускім таварыстве драмы і камэдыі.

**28** — 50 гадоў з дня нараджэньня вадналыжніцы Інэсы Потэс (1956), 14-разовай чэмпіёнкі СССР, чэмпіёнкі Эўропы.

**29** — 75 гадоў з дня нараджэньня матэматыка Фаіны Кірылавай (1931), чальца-карэспандэнта НАН Беларусі.

**30** — Рош-Ашонэ (Новы год) у юдэяў.

75 гадоў з дня нараджэньня Народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча (1931).



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Прагрэс —

Рукапісы, архівы, ліставаньне, чарнавікі — у кампутарна-электронны век нічога гэтага не застаецца пасьля нас. Шанцы захаваньня ў паперы падчас сусьветнай катастрофы значна большыя, чым у вінчэстэра... Піша **Руслан Равяка.**

Цёгаючыся па сусьветным Сеціве ў пошуках матэрыялаў для артыкулу, раптоўна я зразумеў жахлівую рэч. Гісторыкам, што будуць займацца дасьледаваньнем нашага часу, прыйдзецца нашмат цяжэй, чым нашым сучасьнікам, што дасьледуюць якое Сярэднявечча.

Ужо цяпер многія архіўныя дасьледчыкі, працуючы над тэмаю, карыстаюцца мікрафільмамі, але не арыгінальнымі дакумэнтамі.



Зразумела, што прагляд на маніторы не параўнаць з тым адчуваньнем ад дотыку да лістоў з атрамантамі Сярэднявечча, подпісам Ластоўскага, гравюрамі Скарыны ці фатаздымкамі Юліі Дарашкевіч.

Усё больш навуковых працаў зьмяшчаецца толькі ў Сеціве, а многія студэнты пачынаюць свае пошукі зьвестак для курсавых і кантрольных у Інтэрнэце. На жаль, тамака іх і скончаюць…

Магчыма, у прышлым людзі, карыстаючыся Інтэрнэтам і не выходзячы з хаты, здолеюць пісаць дысэртацыі, зьвяртаючыся да архіўных тэчак праз Інтэрнэт, пра якое беларуска-шры-ляндзкае навуковае супрацоўніцтва пачатку XXI стагодзьдзя. Але зьнікне адметнае — даткненьне да мінуўшчыны.

Хуткі прагрэс зробіць немажлівым дасьледаваньне жыцьця і дзейнасьці якой значнай асобы. Выданьне ліставаньня сучаснай «Нашай Нівы» (падобнае да таго, што друкавалася ў зборніку «Шляхам гадоў» у 1990-я гады) ужо на адсоткаў 90 немагчымае. Куды падзенуцца рукапісы, што дасылаюцца ў рэдакцыі й не праходзяць да друку? Паціху адыходзяць паштоўкі, лісты, нататкі, чарнавікі й замалёўкі на паперы. Цяпер лягчэй «пачапіць» якую электронную запіску на працоўным стале манітора. Потым яе чакае лёс у віндаўскай сьметніцы. Тамсама зьнікнуць і электронныя штодзёньнікі прэм'ераў, палітыкаў, мэраў мястэчак, рэдактараў і шараговых грамадзянаў. Архівісты страцяць значны кавалак працы!

Які лёс шматлікіх SMS, MMS e-mail'аў? Колькі іх мы атрымліваем, які час іх існаваньня і колькі іх застаецца? Колькі электронных лістоў пасьля прачытаньня і адказу мы раздрукоўваем і колькі выдаляем, так і не пакінуўшы для вока будучага гісторыка?

Як дасьледаваць ужо цяпер гісторыю разьвіцьця беларускага Інтэрнэту? Здаецца, так нідзе і не захаваліся старыя вэрсіі нашых сайтаў, не апісана іх нараджэньне, сталеньне і сьмерць… Якая згуба для навукі!

Папера, якая ня толькі ўсё церпіць, але і захоўвае значны час

# Архівісты вераць у грамадзянскую адказнасьць

Нашыя папярэднікі слушна заўважылі: «Рукапісы не гараць». Але ці датыкае гэты выраз носьбітаў электроннай інфармацыі — e-mail'аў, SMS'ак? І зь якіх крыніцаў нашыя нашчадкі даведвацьмуцца пра наш цяперашні супярэчлівы час, калі раптам адбудзецца нейкі сусьветны інфармацыйны збой і ўсе інфармацыйныя крыніцы нейкім чынам могуць зьнікнуць? Такім пытаньнем задаецца нашанівец Руслан Равяка. Такі ж запыт мы пераадрасавалі прафэсійным архівістам і гісторыкам. Што яны думаюць па гэтай праблеме?

Вядомы архівіст Віталь Скалабан ня раіць драматызаваць сытуацыі, хоць і падкрэсьлівае, што праблема сапраўды існуе, але паціху яна вырашаецца Цэнтрам электроннай дакумэнтацыі. Сп.Скалабана сёньня найбольш турбуе праблема аўтэнтычнасьці тых ці іншых электронных дакумэнтаў. «Вельмі цяжка цяпер ідэнтыфікаваць многія матэрыялы. Дзе сапраўды аўтарскія лісты, а дзе фальшыўка? І трэба знаходзіць найперш такія мэтады, каб з стоадсоткавай упэўненасьцю ідэнтыфікаваць іх, каб ужо па нейкім часе немагчыма было спэкуляваць гістарычнымі дакумэнтамі».

Дырэктар ужо згаданага «Цэнтру электроннай дакумэнтацыі» гісторык Вячаслаў Насевіч кажа, што ўся інфармацыя зьнікнуць ня можа, і праца ў гэтым

# зьнішчальнік гісторыі

інфармацыю, адыходзіць. Прагрэс чамусьці робіць крыніцы інфармацыі штораз лягчэйшымі для зьнішчэньня. Некалі нашыя продкі пачыналі з каменьня… (Дарэчы, на сёньняшні дзень шанцы захаваньня ў паперы падчас сусьветнай катастрофы значна большыя, чым у вінчэстэра.)

Ужо немажліва адрозьніць ліст арыгіналу ад копіі — лазэрныя друкаркі і ксэраксы робяць усе аркушы аднолькавымі, як кроплі расы. А некалі дасьледчыку дастаткова было толькі зірнуць на паперу, каб зразумець, што тэкст з-пад капіркі.

Больш не пабачыць нам пакамечаных, пакрэсьленых, з малюнкамі чарнавікоў рукапісаў, што творца кідаў праз увесь пакой у сьметніцу (а ўдзячныя нашчадкі іх адтуль выцягвалі й хавалі). Цяперака рукапісы захоўваюць праўкі толькі да часу націску на значак «захаваць», — ніхто не карыстаецца функцыяй захаваньня зьменаў тэксту.

Маю надзею, што навукоўцы пасьля майго артыкулу схамянуцца і праз 50 год у музэях мажліва будзе пабачыць ня толькі мабільнік і SIM-карту прэзыдэнта. Можа, для дасьледнікаў яго дзейнасьці будуць даступныя і электронныя файлы тэлефонных размоваў ППРБ з сынамі, ці гутарка сьпікера палаты з жонкаю ў абедзены перапынак між паседжаньнямі, ці сварка попзоркі са сваім прадусэрам. Зразумела, адбудзецца гэта, калі кампаніі сотавай сувязі даўмеюцца перахоўваць тыя файлы болей за адведзены законам час.

Уявеце, што студэнты ў будучыні пачнуць пісаць курсавыя працы пра жыцьцяпіс Хадановіча, карыстаючыся яго тэлефоннымі размовамі! Палітыкам, творчым людзям ды проста ўсім, хто лічыць сябе значнай асобаю, трэба памятаць пра гэта і ня ляпаць абы-што ў мабілку перад вечнасьцю!

Застаецца толькі спадзявацца, што новае паціху ўвапхнецца ў нашае жыцьцё, не змарнаваўшы старога. Існуюць жа дасюль тэатар, радыё, папяровыя газэты. (Аднак відэакасэты нашымі ўнукамі будуць успрымацца так, як намі вінілавыя кружэлкі!)

Зрэшты, я таксама не прарок (не лічэце мяне ёлупнем, што друкуе гэтыя радкі на друкарскай машынцы) — дасюль пішу і праўлю ў Word'е, захоўваю свае нататкі і артыкулы толькі ў



кампутары. Не, прабачце, некаторыя, найбольш удалыя мае опусы, калі мелі ахвоту і натхненьне, вы маглі пачытаць на старонках «НН».

Таму кідаю пісаць і дасылаю гэты артыкул на друкарку… А пасьля вазьмуся за раздрукоўку сваёй мэйлавай перапіскі. Дзеля гісторыі й яе дасьледчыкаў. Ня ведаю толькі, як доўга захоўваюцца фарбы з лазэрнай друкаркі. Дасьць Бог, даўжэй за факсавыя…

*Баранавічы*

P.S. Усім зацікаўленым магу прапанаваць чаранавікі гэтага артыкулу ў колькасьці 27 аркушаў.

кірунку ўжо вядзецца. «Частка інфармацыі заўжды застанецца. Уся яна зьнікнуць ніяк ня можа, калі прымаць належныя захады. Праца нашага цэнтру і разьлічана на тое, каб не дапусьціць такой сытуацыі. Мы найперш захоўваем тыя электронныя дакумэнты, якія маюць дзяржаўнае значэньне. Гэта ў першую чаргу — афіцыйныя дакумэнты». Але што рабіць з электроннымі прыватнымі архівамі вядомых сучасьнікаў? «Яны самі павінны парупіцца, каб захаваць для нашчадкаў і гісторыі свой архіў, так было заўсёды і ў часы Скарыны, і Агінскага, і Караткевіча, ня толькі ў наш час, — працягвае В.Насевіч. — Я асабіста прапаноўваю шмат каму ўпарадкаваць свой архіў і здаць да нас у Цэнтар, усе згаджаюцца, станоўча хітаюць галавой, але далей за абяцаньні справа не пайшла. Вось, Павал Церашковіч рыхтаваў кнігу, абяцаў, але не прынёс электроннае вэрсіі».

Архівіст Аляксандар Запартыка лічыць, што ўсе электронныя дакумэнты належыць дубляваць і старанна захоўваць адзін з экзэмпляраў у адмысловай базе зьвестак, тады і ня будзе ніякіх праблемаў.

Адзіным, хто патрапіў мець сякую-такую заклапочанасьць у стане з электроннымі крыніцамі, стаў гісторык Алесь Белы. «Апошнім часам няспынна мяняюцца носьбіты інфармацыі. Здаецца, толькі нядаўна былі відэамагнітафоны, не пасьпелі як сьлед апаматацца, як іх замяняюць на DVD. Часам проста немагчыма пасьпець за тэхнікай. У сэнсе перадачы інфармацыі зьмяняюцца цэлыя макраэпохі». Але Алесь Белы не губляе надзеі, ён кажа, што моцныя культурныя вобразы пройдуць праз любыя гістарычныя фільтры і ня зьнікнуць ні пры якіх умовах, бо і ў часы фараонаў гэтыя самыя фільтры былі ніяк ня меншыя.

**Зьміцер Панкавец**

# Смак бяседы

Вольны час — найбольшая пагроза таталітарызму. Піша гісторык **Алег Дзярновіч**.



### Фэдэрацыя суседзтваў

Шляхецкае грамадзтва Вялікага Княства, дый Рэчы Паспалітай увогуле, у XVI—XVIII ст. было своеасаблівай фэдэрацыяй суседзтваў. Прасторавая структура краю ўяўляла сабою мноства ізаляваных лякальных супольнасьцяў. У такіх умовах наладжваньне бяседаў — збору гасьцей дзеля пачастунку і гутаркі — выконвала важную інтэгральную функцыю. Зьнітоўвала ў адзіны арганізм размаітыя кланы, характары, інтарэсы ды забясьпечвала паміж імі сталыя камунікацыі. Сьцьвярджалася: «Не купляй маёнтак, а купляй суседа!» Што важна: у часы, калі грамадзтва было арганізавана паводле прынцыпаў мужчынскіх саюзаў (войска, сойм, царква, унівэрсытэт, карчма), на бяседы зьбіраліся сем’ямі, і гэтым самым да публічнага жыцьця, хаця б у такой форме, далучалася яшчэ адна палова насельнікаў краю — жанчыны.

### Госьць у дом — Бог у дом

Праз тое, што падобныя бяседы былі настолькі істотныя для супольнасьці, узьнік культ госьця. Старая прымаўка сьцьвярджала: «Госьць у дом — Бог у дом!» Уявім сабе тагачасны шляхецкі двор зь вялікай сям’ёй, дзе жыло супольна некалькі пакаленьняў, калі не лічыць далёкіх крэўных, кліентаў, служкаў. У гэтым шумным асяродку, дзе людзі вымушаны працяглы пэрыяд суіснаваць, павінны былі выпрацавацца таварыскія мадэлі арганізацыі зносінаў ды запаўненьня часу, які, што звыкла на вёсцы, цягнуўся павольна. У доўгія зімовыя вечары людзі зьбіраліся разам, размаўлялі, выпівалі, бавілі час, пільнуючыся адпаведных формаў ды звычаяў. Можна зразумець радасьць гэтай грамады, калі манатоннасьць жыцьця перапыняў госьць, які прыносіў навіны ды лёгкую бадзёрасьць для забаваў. Для прыбылага шырока адчыняліся брама і сэрцы.

Візыты больш ці менш афіцыйнага характару мелі складаны цырыманіял: неабходна было вытрымаць пэўныя фармальнасьці, каб не парушыць традыцыю прыёму і не пакрыўдзіць госьця. Найперш трэба было чакаць ды прывітаць госьця на ганку дому. Экіпаж павольна ўяжджаў на падворак, каб даць гаспадарам адпаведны час на падрыхтоўку да вітаньня. Гасьцей урачыста ўводзілі ў пакоі, прычым гаспадар запрашаў госьця, а гаспадыня — ягоную жонку. «Не абышлося без камплімэнтаў, без цырымоніяў ля дзьвярэй і пры заняцьці месца, калі сядалі», — прыгадваў мэмуарыст. Пад уплывам школьнай рыторыкі ўтварыўся пэўны стыль такіх прамоваў. Недастаткова было сказаць штосьці сутнасна і каротка — неабходна было скласьці цэлую прамову, падчас якой патрабавалася стаяць, ухвалялася выкарыстаньне жэстаў і спэцыяльнай, пажадана лацінскай, фразэалёгіі.

### Пацалункі сяброў

Адметнасьцю таварыскіх прыві

таньняў на нашых землях часта былі пацалункі. Звычай гэты быў невядомы на Захадзе, і пры пашырэньні ў XVI ст. італьянскага этыкету пацалункі пры сустрэчы сталі выходзіць з ужытку. Знаны паэт XVII ст., нашчадак старажытнага пінскага баярства Ян Пратасовіч такім чынам характарызаваў сытуацыю: «Сёньня гэты звычай амаль зьнік у Польшчы, але яшчэ захаваўся толькі сярод прастакоў на Русі» (тут, вядома, меліся на ўвазе беларускія і ўкраінскія землі). Барочная эстэтыка зноў вярнула гэтую традыцыю. І ня толькі ў Вялікае Княства — вядомы цяпер так званы французскі пацалунак ёсьць рэмінісцэнцыяй гэтай станавай адзнакі тварыскасьці.

## Абед без накрыцьця

Гасьцінны стол мусіў быць накрыты абрусам — няветлівым лічылася частаваць госьця за ненакрытым стала. Падобны казус здарыўся ў Маскве з пасламі ВКЛ: іх паклікалі на абед да стала без пакрыцьця... Інцыдэнт быў даволі хутка вычарпаны — крамлёўскія адміністратары распарадзіліся прынесьці абрус.

Асноўны ж час прыёму праводзіўся пры стале. Прыбылага належала павітаць келіхам, а потым запрасіць на абед ці вячэру. Было недапушчальным і ў думках, каб госьць ад'ехаў, не прысеўшы да стала. Нават калі гэты чалавек быў зусім чужы. Ежы не бракавала, апэтыты былі някепскія. Пры стале разьвязваліся языкі, а афіцыйна-напышлівы стыль прывітаньня зьмяняўся таварыскай гутаркай, вясёлосьцю, забавамі. Келіхі, якія пад канец абеду пачыналі часьцей курсаваць, бадзёрылі кампанію. Менавіта тады ўтваралася прастора для навінаў, аповедаў пра вайну і палітычнае жыцьцё, для прыцягненьня прыхільнікаў, для ўладкаваньня розных справаў, прыватных ці публічных. Натуральна, мусіў быў утварыцца спэцыяльны рытуал бяседаў — у ежы і пітве абмежаваньняў не існавала, але ўдзельнік застольля мусіў заставацца «палітыкам» — гэта значыць чалавекам, што ўмее адпаведным чынам трымацца і не губляць над сабою кантролю. Хоць падчас самога абеду звычайна пілі піва, а ўжо пад канец прыносілі віно ды наліўкі — і тут пачыналася сапраўдная выпіўка. XVI ст. было ў гэтым сэнсе даволі стрыманае.

## Таварыскае жыццё

Але паступова, з памяншэньнем культурных матывацыяў, з-за разбурэньня краю войнамі, з ростам заможнасьці простага шляхціца, які сплаўляў збожжа да Рыгі і Гданьску, зьявілася п'янства. У якасьці адмоўнага прыкладу сатырыкі і рэлігійныя маралісты XVII ст. падавалі Радзівілаў — маўляў, зь пераходам у пратэстанцва яны набылі іншыя моды, пачалі выпіваць ды прызвычаілі да гэтага іншых сэнатараў, а зь іх ужо і шляхта брала прыклад. Пік п'янства прыпаў на «саксонскія часы» (канец XVII — першая палова XVIII ст.). У Вялікім Княстве пілі болей, чым, напрыклад, у Малой Польшчы. Хіба што за Станіславам Аўгустам у другой палове XVIII ст. надышло працьверазеньне. Каб усё ж паўстрымліваць шкодную звычку, цырыманіял бяседаў усё больш ускладняўся, ад удзельнікаў патрабавалася актыўнасьць. Прамаўленьне тостаў усімі прысутнымі стала абавязковым.

Жыццё ў даўняй Беларусі і Літве было вельмі таварыскае. Мэмуары XVI—XVIII ст. паказваюць нам карціны таго, як супольна сілкаваліся і выпівалі, раіліся і маліліся, разам бавілі час і працавалі. Ва ўсёй гэтай сыстэме ўзаемадачыненьняў бяседы рытуалізоўвалі, акультурвалі разнастайныя кантакты, стрымлівалі заганныя звычкі і, часам, гасілі адмоўныя эмоцыі.

## Індустрыяльныя вакацыі

Індустрыяльны працоўны тыдзень у Беларусі эвалюцыянаваў ад 70-гадзіннага ў пачатку XX ст. да 40-гадзіннага ў другой палове XX — пачатку XXI ст. Сацыялёгія разглядае вольны час ня проста як непрацоўны альбо як час для адпачынку. Вольны час — гэта непрацоўны час мінус час, неабходны на вядзеньне хатняе гаспадаркі, на сон і г.д. Значная рэзэрва вольнага часу сталася фэномэнам XX ст. Над ягонымі функцыямі задумаліся яшчэ ў XIX ст. Карл Маркс называў вольны час найвялікшым багацьцем, маючы на ўвазе яго патэнцыял для грамадзтва. Дагматычныя пасьлядоўнікі марксізму ўспрынялі гэтую тэзу як папярэджаньне пра пагрозу. Усе таталітарныя рэжымы XX ст. імкнуліся штучна абмежаваць вольны час — ня толькі працай, але і ідэалягічнымі мерапрыемствамі. Лічылася небясьпечным пакідаць чалавека самому сабе, а тым больш дазваляць незалежныя грамадзкія камунікацыі і аб'яднаньні. Менавіта таму, калі ў СССР закончыўся пэрыяд масавага тэрору, адной з галоўных тэмаў даносаў у партыйныя органы і КГБ сталі сяброўскія бяседы — хто зьбіраўся, якія анэкдоты расказвалі, што крытыкавалі...

Адзін з такіх эпізодаў апісаны ў сучаснай беларускай мэмуарыстыцы. Гаворка вядзецца пра своеасаблівы гурток, што склаўся на менскай кватэры пісьменьніцы Лідзіі Вакулоўскай, дзе рэгулярна зьбіралася вальнадумная інтэлігенцыя. У сваіх успамінах Валянцін Тарас назваў гэтую кампанію «занадта вялікай і стракатай». Як высьветлілася пазьней, у клюб пранікла пазаштатны агент КГБ Зоя Б. Зь лістапада 1967 г. пачаліся перасьледы гаспадыні кватэры — яна трапіла пад цэнзурныя абмежаваньні, раскручвалася «справа Вакулоўскай». Пётар Машэраў, выступаючы на партактыве, з гэтай нагоды заявіў, што «кампэтэнтныя органы ўскрылі антысавецкі нарыў», а «з асобамі, якія рэгулярна наведвалі кватэру сябра Саюзу пісьменьнікаў Л.А.Вакулоўскай, дзе сыстэматычна ладзіліся п'янкі ды вяліся злосныя антысавецкія размовы», пачалі праводзіцца «прафіляктычныя гутаркі».

## Гараджане гуляюць у вяскоўцаў

Сёньня адпачынак ахоплівае сабою тыя забавы, што некалі былі заняткамі дзеля здабычы жыцьцёвых сродкаў — рыбалоўства, паляваньне, зьбіраньне грыбоў і г.д. Жыццё падчас вакацыяў ператвараецца ў вялікую забаву: гараджане гуляюцца ў вяскоўцаў, горцаў, рыбакоў, жыхароў лесу... Вельмі вялікая ўмоўнасьць прысутнічае і ў турыстыцы. Гід фармуе для турыста навакольны сьвет, пазьбягаючы рэальнага жыцьця, хіба што яно «маляўнічае» — гэта значыць, пасьля вяртаньня яно набывае статус вобразу. Турыст носіць з сабою фотаапарат і ў скрайніх выпадках займаецца больш фатаграфаваньнем, чымсі сузіраньнем. Гульня ўвогуле ёсьць неад'емнай часткай натуры чалавека.

Але ад старажытных формаў арганізацыі часу і кантактаў нам яшчэ засталася бяседа. Варта не губляць пачуцьця аўтэнтыкі і захаваць гэтую праяву ўласнага сувэрэнітэту.

# Сокалаў-Воюш шукае перакладніка з румынскае

На жаль, бард **Сяржук Сокалаў-Воюш** апошнім часам ня часты госьць на Радзіме. Ужо пятнаццаць гадоў, як ён жыве за мяжой. Але Сяржук спрабуе не забывацца на Беларусь. Гэтым летам ён прыехаў зь сям'ёй на Бацькаўшчыну, на якой ня быў пяць гадоў. «НН» не прамінула магчымасьці пагутарыць з мэтрам аўтарскай песьні.

## «Гатовы, што мяне закідаюць памідорамі»

**«Наша Ніва»: Сяржук, якім ветрам на гэты раз Вас занесла на Радзіму?**

**Сяржук Сокалаў-Воюш:** Прыяжджаць дадому заўсёды прыемна і жадана, незалежна ад таго, што тут робіцца. Яна для мяне нават з-за акіяну падаецца блізкай. Я прыляцеў не адзін, а з жонкай і сынамі, якія вельмі хацелі ўбачыць краіну бацькоў. Сьветавіт і Славамір — амэрыканскія скаўты, таму ім было б цікава ўбачыцца і паразмаўляць зь беларускімі скаўтамі, падзяліцца досьведам. На летнія вакацыі дзецям у амэрыканскіх школах задаюць зрабіць які-кольвек праект, дык старэйшы загарэўся жаданьнем прысьвяціць яго праблеме чарнобыльскай катастрофы. Сустрэцца тут зь людзьмі, паразмаўляць. На 24 жніўня ў мяне квіток назад.

**«НН»: Напэўна, прыехалі ў Беларусь не з пустымі рукамі?**

**СС:** Канечне, не. Я прывёз з сабой новую праграму «Песьні лісоўчыкаў», якую буду прэзэнтаваць менскім слухачам. Лісоўчыкі — гэта беларуская кавалерыя, якая наводзіла страх далёка за межамі краіны. Яны маглі пераадольваць вялікія адлегласьці за раз, бо ішлі без усялякага абозу, а харчаваліся тым, што знаходзілі ці адбіралі па дарозе. Камандаваў імі палкоўнік Аляксандар Лісоўскі, уласна ад яго і пайшла назва. Аднаго зь лісоўчыкаў на карціне выявіў нават сам Рэмбрант.

Гэтыя песьні будуць выкананыя мною без музычнага суправаджэньня. Я не чакаю станоўчых рэакцыяў, прыму, калі слухачы абсьвішчуць і закідаюць мяне гнілымі памідорамі, але такім чынам я спрабую выйсьці з крызісу, які напаткаў бардаўскую песьню. Трэба шукаць новыя шляхі і выйсьці, каб ізноў у людзей зьявілася цікавасьць да бардаў.

**«НН»: А ці будзе асобная плытка?**

**СС:** Хутчэй за ўсё яна будзе запісаная яшчэ цяпер, калі я знаходжуся ў Беларусі. Буду пісацца ў студыі Андрэя Плясанава. Гэта будзе адзінкавы запіс, што выйдзе, тое выйдзе. Я ніколі дагэтуль не працаваў у студыі. Гэта на плошчы ў мяне няма адсутнасьці комплексаў, а ў студыі… Ня ведаю, што з гэтага можа атрымацца. У кружэлку, дарэчы, увойдуць і старыя песьні, бо якасных запісаў няма па сёньня.

## «Дракула як станоўчы герой»

**«НН»: Сяржук, а літаратурнай працай цяпер займаецеся? Чаго варта чакаць пасьля «Крывавага памолу»?**

**СС:** «Крывавы памол — 2». Я абсалютна сур'ёзна. Працу над кнігай вяду ўжо два гады. Мае героі ў рамане трапляюць у Асманскую імпэрыю, і вось тут аказалася, што я абсалютна нічога ня ведаю пра Турэччыну. Пачаў рыхтаваць слоўнік Асманскай імпэрыі, ладная такая «кніжачка» выйшла, працаваў з год, але мае героі вырашылі не затрымлівацца ў Турэччыне і пераехалі ў Румынію. Цяпер вось шукаю знаўцу румынскае мовы, каб перакласьці баляду пісьменьніка XIX стагодзьдзя Будая Дзеляну. Нават хацеў у амбасаду малдаўскую зайсьці ў Менску, але падумаў, што яны ня справяцца з такім творам. Дарэчы, Дракула ў другой частцы будзе станоўчым героем, які якраз і будзе змагацца з усёй нечысьцю.

**«НН»: «Крывавы памол» крытыкавалі за празьмерна цяжкую мову. Як будзе з другой часткай?**

**СС:** Яшчэ горш. (Сьмяецца.) Я выкарыстаў там усе вядомыя мне лексычныя адзінкі. Мая пазыцыя такая: калі слова супадае з расейскім і ёсьць іншы беларускі адпаведнік, я абавязкова ўжыву апошні. Няхай чытачы вучаць мову. Я ўжываў лексэмы са слоўнікаў Ластоўскага, Некрашэвіча—Байкова, дыялектных. Хоць з дыялектызмамі трэба быць вельмі асьцярожным. Некалі я чуў, як размаўляюць два крымінальнікі, дык адзін па ходзе размовы прыдумляў новыя словы. Падобна й з аўтарамі дыялектных слоўнікаў.

## «Прабачце мне за Плошчу»

**«НН»: Сяржук, чаму Вы не былі на Плошчы?**

**СС:** Мне вельмі сорамна праз гэта. Я хачу ва ўсіх, хто быў у намётах, папрасіць прабачэньня, што я ня быў з вамі. Гэта цэлы шэраг і сямейных, і матэрыяльных складанасьцяў. Канечне, я б мог вырвацца, але не зрабіў гэтага. Я сачыў за падзеямі Плошчы праз Інтэрнэт. Тэлефанаваў сябрам у Беларусь, цікавіўся апошнімі навінамі. Я, ледзьве перамагаючы сорам, затэлефанаваў сябрам пасьля іх вызваленьня з турмаў. Яны сказалі: «Не перажывай, пасядзіш і ты». Вось толькі калі будзе наступная такая магчы-

## «Цяпер нас шмат»

Канцэрт Сержука Сокалава-Воюша 22 жніўня сабраў поўную залю Дому літаратара. Публіка пачала зьбірацца за гадзіну да канцэрту. На пачатку пра знанага беларускага барда распавёў яго аднагрупнік Вінцук Вячорка. Распачаў канцэрт Аляксандар Плясанаў, лідэр гурту «PLAN».

Сокалаў-Воюш прасьпяваў цыкль песьняў пра касінераў, выканаў акапэльна колькі песень з новага альбому «Лісоўчыкі». Зьвяртаючыся паміж песьнямі да прысутных, Сяржук зазначыў: «У тыя часы, пра якія тут казаў Вінцук, мы нізавошта не сабраліся б такой колькасьцю, каб паслухаць беларускую песьню. Цяпер нас шмат, і хутка мы выйдзем шчыльнымі радамі».

СП


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

масьць і ці будзе ўвогуле?

**«НН»: Дык няўжо Вы ніяк не паўдзельнічалі ў прэзыдэнцкіх выбарах?**

**СС:** Нягож — канечне, паўдзельнічаў. Я зьбіраў подпісы за Аляксандра Мілінкевіча, напэўна, адзіны ў Нью-Ёрку. Дакладней, подпісы хацеў зьбіраць багата хто, але іх не рэгістравалі. Я зрабіў хітрэй, зарэгістраваўшыся праз Наваполацак. Трэ было бачыць твары дыпляматаў у пасольстве, калі я прынёс тыя подпісы. Нічога падобнага яны не чакалі. Пасьля ўдалося зладзіць амаль 100-адсоткавы экзытпол на сваім выбарчым участку. Мілінкевіч набраў менш за палову галасоў, але больш за Лукашэнку. Мусіў быць другі тур.

## «Камплексую па-беларуску»

**«НН»: Сяржук, што зьмянілася ў краіне за гэтыя пяць гадоў, якія Вы не былі ў Беларусі?**

**СС:** Краіну татальна спойваюць. Я быў уражаны ад колькасьці ўбачаных на вуліцах падлеткаў з бутэлькамі піва ў руках. Прычым робяць гэта мэтанакіравана. Мы зь дзецьмі паехалі на машыне ў Сітна да Севярынца. На дарозе галасуе маладая кабетка, п’яная, з ног валіцца. Яна нам і паведаміла, што пляшка гарэлкі, прывезенай з Расеі, каштуе 2100 рублёў. Што гэта такое, адкажэце? Калі б гэта была канкурэнцыя, то цэны вагаліся б у раёне ста-двухсот рублёў, а тут... Колькі маіх былых наваполацкіх сябрукоў пасьпіваліся, і не пералічыш. Убачыў аднаго: «Друг, памагай, дай на бутэльку».

**«НН»: А зьменаў да лепшага хіба няма?**

**СС:** Як ні балюча, але няма. Не гаварыць жа пра чысьціню вуліцаў. Мае дзеці ведаюць толькі беларускую і ангельскую, як ім прыходзілася пакутаваць праз тое, што гавораць па-беларуску.

**«НН»: Вы застаецеся грамадзянінам Беларусі?**

**СС:** Так. Я не разумею, нашто мне мяняць грамадзянства. Я ня ўмею размаўляць інакш, як па-беларуску. Я працягваю камплексаваць на нашай мове.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

### Сяргей Вітушка пра лісоўчыкаў і прыезд Воюша

«Колькі часу мінула, а Воюш застаецца ранейшым, гэткі ліхі казак у сядле, які яшчэ і шабелькай памахвае. Сапраўды, песьні краналі за душу. Іх ніхто ўжо так шчыра не засьпявае як, Сяржук. З іроніяй, зь лёгкім цынізмам, ён не саромеецца гэта рабіць, бо мае права на гэта, як і ўсё нашае пакаленьне.

Вельмі зьдзівіла новая нізка сьпеваў Сержука «Песьні лісоўчыкаў». Некалі Сокалаў напісаў песьню «Дзе Купала начавала», дык пасьля я бачыў яе ў нейкім зборніку як народную. І вось цяпер таксама стылізацыя пад народныя сьпевы. Арыгінальны і ўдалы крок.

Але на месцы Сержука я б асабліва не выхваляўся той нашай гісторыяй, бо нашы dаяры ўрэшце прайгралі вайну маскавітам, таму і глядзіцца ўсё крыху недарэчна. Трэба захоўваць у гэтым пытаньні залатую сярэдзіну.

Вельмі ўсьцешыла, што Сяргей у Менск прыехаў не адзін, а разам з жонкай і сынамі. Трэба ўсім нам павучыцца ў Воюша, як далёка ад Радзімы можна выхоўваць беларусікаў».

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 26 жніўня

**АНТ, 14.10**

«Чароўная гісторыя».

Вялікабрытанія—ЗША, 1997, рэж. Чарлз Стэрыдж.

Фільм для дзяцей.

Пасьля Першай сусьветнай вайны ў вёсцы жывуць дзьве стрыечныя сястры. Дзяўчынкі любяць хадзіць да крыніцы, дзе сустракаюць... фэй. Казачнымі істотамі зацікавіліся й дарослыя — Артур Конан Дойл і фокусьнік Гары Гудыні.

Дзецям неабходныя казкі...

У «дарослых» ролях — клясык брытанскага кіно Пітэр О’Тул і амэрыканскі «незалежнік» Гарві Кейтэл.

**АНТ, 17.55**

«Гуляй, як Бэкхэм».

Вялікабрытанія—Нямеччына, 2002, рэж. Гурындэр Чадха.

Рамантычная камэдыя.

Юная Джэсі, дачка суворых бацькоў, употайкі грае ў футбол. Але ў мітусьні сямейных сьвятаў яе тайна можа быць выкрытая...

Індыйскія мэлёдыі, рытм Эўропы — і посьпех па ўсім сьвеце. Прызы глядацкіх сымпатый у Таронта, Сыднэі, Лякарна.

Ролі выконваюць: Парміндэр Награ, Кіра Найтлі, Джонатан Рыз-Мэерз.

**СТВ, 20.15**

«Прыгажунька».

ЗША, 1990, рэж. Гэры Маршал.

Рамантычная камэдыя.

Стомлены багацей (Рычард Гір) закахаўся ў сымпатычную прастытутку (Джулія Робэртс). Душаразьдзіральніцкая гісторыя Папялушкі. Пасьля прэм’еры Робэртс прачнулася знакамітай.

**«Лад», 21.45**

«Ван Гог».

Францыя, 1991, рэж. Морыс Піяла.

Драма.

Апошнія месяцы жыцьця знакамітага мастака...

Рэжысэр Морыс Піяла — удумлівы й сур’ёзны аўтар. Актор Жак Дзютро за ролю Ван Гога атрымаў «Сэзара».

**БТ, 23.20**

«Сьмяротны лябірынт».

Вялікабрытанія—Нямеччына, 2004, рэж. Стывэн Н.Манро.

Псыхапатялягічны трымценьнік.

9 чалавек замкнёныя ў доме. Хто выйграе — атрымае 5 млн. Але для гэтага трэба забіць свайго бліжняга...

У галоўнай ролі — «enfant terrible» амэрыканскага кіно Дэніс Хопэр.

**СТВ, 00.05**

«Асаджаныя».

Італія—Англія, 1998, рэж. Бэрнарда Бэрталючы.

Драма.

Маладая афрыканка працуе пакаёўкай у сьціплага ангельчаніна. Яны амаль што не размаўляюць, але паміж імі нараджаецца «музыка»...

Бэрталючы — клясык сусьветнага кіно.

Ролі выконваюць: Дэйвід Т’юліс, Тандзі Ньютан.

### Нядзеля, 27 жніўня

**АНТ, 13.40**

«Гамлет».

Вялікабрытанія—ЗША—Францыя—Гішпанія, 1990, рэж. Франка Дзэфірэльлі.

Экранізацыя аднайменнай трагедыі Ўільяма Шэксьпіра.

Італьянскі майстра прапануе сваю вэрсію слыннай трагедыі.

Ролі выконваюць: Мэл Гібсан, Глен Клоўз, Гэлена Бонэм-Картэр.

**БТ, 22.20**

«Дамскі пакой».

Канада—Вялікабрытанія, 1999, рэж. Пэнэлопа Бэтэніўм.

Фантастычная камэдыя.

Чорна-белы пакой са шматлікімі дамамі. Джулія й Ларэн аніяк ня ўцямяць, а што яны тут робяць? Але высьвятляецца, што гэта Чысьцец...

**Андрэй Расінскі**




## КАІСА

# Скахографы ідуць

Выглядае, нашы леташнія нататкі пра выяўленчыя задачы на шахматнай дошцы трапілі ў струмень. Усё болей і болей кампазытараў Беларусі (сярод іх вылучаюцца прадпрымальнік Аляксандар Міхалап і пэнсіянэр Павал Радзюк) аддаюць належнае фармалістычным фокусам з помаччу падручных сродкаў — тур, коней ды пэшак.

Мянчук Іван Чэпа, супрацоўнік Гуманітарна-эканамічнага ўнівэрсытэту, які і сам складае скахаграфічныя творы, распавёў пра тэндэнцыю ў сьвежым выпуску шахбюлетэню «Альбино» (Лунінец). Найчасьцей аматары выяўляюць літары і лічбы — да юбілеяў сваіх сяброў або іншых помных датаў. Напрыклад, да Дня перамогі.

Матэрыял, прысьвечаны стагодзьдзю першага беларускага шахматнага майстра Ўладзіслава Сіліча («НН», № 26), таксама падштурхнуў творцаў да дзеяньня. У рэдакцыю паступілі дыяграмы зь фігурамі, расстаўленымі ў выглядзе літараў «У» і «С». Аўтар першай падборкі — Вадзім Жылко, рэдактар «Альбино».

Зьмест у скахаграфіі зазвычай прыносіцца ў ахвяру форме. Вось як пра тое гаворыць лідзкі журналіст і кампазытар Алесь Сымановіч: «Галоўнае, каб задачы былі карэктныя, а ідэя, складанасьць, тэматыка адыходзяць на другі плян. Рашальнікі гэта добра разумеюць». Стварэньне задачак у зададзеных рамках вучыць эканомна разьмяркоўваць рэсурсы. Дык далучаймася да хеўры скахографаў!

**ВР**

**Дыяграма. В.Жылко, 2006.**

«У»: Мат за 2 хады (блізьня — памяняць месцамі караля b2 і пешку c4).

«С»: Мат за 2 хады (блізьня — памяняць месцамі караля h3 і туру g7).



**Адказы:**
«У»: 1. Кd6 і 2. Сb6Х. Блізьня — 1. Кd4 і 2. Кc6Х. «С»: 1. Те4 Крg6 2. Кh4Х (1...h5 2. Се4Х). Блізьня — 1. Крf7 і 2. Тh5Х.

# Канцэрт За Свабоду

## 25 жніўня

А 18-й гадзіне на плошчы Бангалор у Менску пройдзе канцэрт з удзелам вядомых беларускіх гуртоў: «N.R.M.», «Крама», «Tav. Mauzer», «Памідор/OFF», «PLAN», «Band A» ды інш. Мерапрыемства дазволенае Менгарвыканкамам.

Калі вы хочаце сабрацца ў грамадзе аднадумцаў, каб адпачыць перад заканчэньнем вакацыяў, пачуць і падтрымаць нашых свабодных музыкаў — прыходзьце самі, а таксама абтэлефануйце і прыводзьце з сабой сяброў.

25 жніўня спаўняецца 15 гадоў з моманту наданьня Дэклярацыі аб сувэрэнітэце Беларусі статусу канстытуцыйнага акту.




**ФОТАВЫСТАВА**

**«ЗА СВАБОДУ Й НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ»**



24 жніўня

**Вясна 2006 ў аб'ектыве**

18.00. Чацьвер
вул. Машэрава, 8

Удзел у адкрыцьці возьмуць Аляксандар Мілінкевіч, Вінцук Вячорка, а таксама музыкі Свабоды, аўтар найлепшага здымку на plenka.net будзе ўганараваны.

Ігар Крашэўскі, Вольга Рудніцкая й Хмара Захараўна сабралі найлепшыя фатаздымкі з Сакавіка, адтвараючы атмасфэру тых дзён.

**КІНО НА ВЫХОДНЫЯ**

# Небалючае разьвітаньне

**Мне не балюча** (Мне не больно).

Расея, 2006, каляровы, 104 хв., рэж. Аляксей Балабанаў.

**Жанр:** мэлядрама.

**Адзнака:** 7,5 (з 10).

Аляксей Балабанаў — прарок патаемных жаданьняў расейскае публікі і ейных самых глыбінных комплексаў. Перабудовачная калатнеча адбівалася ў фільмах паводле Кафкі й Бэкета, ксэнафобскі «Брат» папярэднічаў пуцінскай эпосе, імпэрскі патрыятызм «кіраванае дэмакратыі» знайшоў сваё месца ў «Вайне». Дасьціпная мэлядрама «Мне не балюча» прадказвае новае разьвітаньне.

Утрыманка новага расейца Натэла спакусіла маладзенькага дызайнэра Мішу. Міша закахаўся ў Натэлу па самыя вушы, але ў гераіні ёсьць свая балючая тайна.

Балабанаў ламае імпэрска-бравурную традыцыю й адыходзіць ад бяздумна-фальшывых мэлядрамаў «нафтавага» часу. Героі карціны не макеты «шчасьця», а жывыя людзі. Пакутліва-дзіўная Рэната Літвінава ў ролі Натэлы, клапатлівы Аляксандар Яцэнка (Міша) і нават «новы расеец» Міхалкоў — шчымліва-разгублены. А коснаязыкая архітэктарка (Інга Аболдзіна-Стралкова) і лірычны Дзьмітры Дзюжаў — гэта адмысловыя трукі.

Кожны з герояў нешта губляе, бо гераіня сыходзіць. Дзіўная Натэла губляе жыцьцё — і Рэната Літвінава не баіцца падацца страшнаю, парцалянавай. Архітэктарка губляе Радзіму, герой Міша — каханую. Усе разам губляюць супольны лёс — і ён ужо ня будзе цукерна-фальшывым дый палітычна адлякаваным.

Але нам не балюча. Карціна неверагодна сьветлая й пранізьлівая. Густоўна падабраная закадравая музыка, праўдзівая акторская гульня ды інтанацыі новага разьвітаньня — для новай і невядомай сустрэчы.

**Андрэй Расінскі**

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.** Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям’ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу,

# Шчыры дзякуй за ахвяраваньні

**Валянціне Ш., В.Ц., Тацяне Г., Ніне К., Рыгору Р., Л.К., Т.З., А.К., Зьмітру К., Вадзіму М., Уладзіславу Ж., А.Л., Л.Ф., Натальлі Р., Але Г., Кацярыне Я., Галіне Ж., Зьмітру К., Віталю В., Станіславу Ш., А.К., Але Т., Аўгену Л., Дыяне Ф., А.С., І.Л., А.Р.** зь Менску.
**Алене Ф.** зь Менскага раёну.
**Міхалу Л.** з Слуцкага раёну.
**Вользе А.** зь Любанскага раёну.
**Ірыне Ц.** з Жыткавічаў.
**Андрэю С.** з Воршы.
**Зьмітру К.** з Мастоў.
**Кастусю З.** зь Віцебску.
**А.Н.** з Барысаўскага раёну.
**Галіне Г.** з Фаніпалю.
**Валеру П.** з Баранавічаў.
**Мікалаю В.** з Пружанскага раёну.
**Мікалаю Ч.** з Наваполацку.
**Пятру П., Г.К.** з Горадні.
**Зьмітру Д.** з Бабруйску.
**Тадэвушу Ш.** з Маладэчна.
**Міхаілу Г.** з Гомельскага раёну.
**Уладзімеру Д.** з Гомелю.
**Лідзіі М.** з Калінкавіцкага раёну.
**Сяргею С.** з Полацку.

Дыяна Леанідаўна зь Менску, паведаміце, калі ласка, нумар сваёй кватэры.
Сяргей Рыгоравіч Н., паведаміце, калі ласка, свой адрас.
М.В.Е. з вуліцы 17 верасьня, удакладніце адрас.
С.В.А. з Радашкавічаў, дашліце дакладны адрас.

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

**Кассир** **Плательщик**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

**КВИТАНЦИЯ**

**Кассир** **М.П.** **Плательщик**

лицензия № 02330/0056637 от 27.03.2004 УП «УСЛУГА» Зак. 3504 тир 50 000

## На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць. На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

# калі б...

**...беларускія кандытары, якім забаранілі продаж прадукцыі ў Расею з-за аднолькавых з расейцамі назваў, перайменавалі цукеркі, памятаючы, што «замежны гандаль — гэта прапаганда беларускай мадэлі».**




Пакупнік: «Дайце мне, калі ласка, 200 грамаў «Мішка на Поўначы як чалавечы фактар», 100 грамаў «Тэатральнай узважанай шматвэктарнай палітыкі» і пакет «Узьлётных заробкаў супрацоўнікаў АПК у кантэксьце рэалізацыі праграмы 3–й пяцігодкі».

**...гальштукі, якіх не ўзялі ў Сочы на нефармальны саміт прэзыдэнтаў бяз гальштукаў, вырашылі адпомсьціць гаспадарам.**




— Падчас нефармальнага саміту гальштукаў без прэзыдэнтаў беларускі і расейскія бакі дамовіліся аб роспуску саюзнай дзяржавы.

МАЛЮНКІ І ТЭКСТЫ ЛЁЛІКА УШКІНА

## У НУМАРЫ

### Гэтым пераможам



Што нацыянальнаму руху рабіць зь дзяржавай? Артыкул Сяргея Богдана. **Старонка 13.**

### Калі беларусы сыходзяць у лес



Самы выгодны бізнэс у Сітна-сіці — лісічкі. Піша Павал Севярынец. **Старонка 15.**




## ГІСТОРЫЯ Ў «НН»

**Прагрэс — зьнішчальнік гісторыі**

Рукапісы, архівы, ліставаньне, чарнавікі — у кампутарна-электронны век нічога гэтага не застаецца пасьля нас. Шанцы захаваньня ў паперы падчас сусьветнай катастрофы значна большыя, чым у вінчэстэра... Піша Руслан Равяка. **Старонка 22.**

**Смак бяседы**

Шляхецкае грамадзтва Вялікага Княства, дый Рэчы Паспалітай увогуле, у XVI—XVIII ст. было своеасаблівай фэдэрацыяй суседзтваў. Піша Алег Дзярновіч. **Старонка 24.**

**Таямніца «залатога запасу» БНП**

Да 100-х угодкаў з Дня народзінаў Юльяна Саковіча. Піша Сяргей Ёрш. **Старонка 21.**

ПАТРАБУЮЦЦА
КАМЕНШЧЫКІ
*для працы ў Менскай вобласьці*
АПЛАТА ЗЬДЗЕЛЬНАЯ АД 1 000 000 РУБЛЁЎ У МЕСЯЦ
ВЫПЛАТА 2 РАЗЫ НА МЕСЯЦ
тэл. у Менску (017) 259-17-65

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Сяргею Г. з Магілёва.** Жорсткую казку пра беласаў і Алуку прапануйце якому нефармальнаму літаратурнаму выданьню. Для «НН» не пасуе.

**Сяргею С. з Барысава.** Дзякуй за ліст. Дык у вас цэлая гісторыя! Спакойна вучыцеся і трымайцеся свайго, каб быць апораю бацькам. Меркаваньні кагосьці, хто «разам працаваў», могуць быць вельмі хітраю формаю прапаганды, але сказаць напэўна тут цяжка.

**І.Ч. зь Менску.** Касьпяровіч — гэта чалавек, які хацеў зьдзейсьніць сымбалічны акт замены каляніяльнага сьцяга беларускім. Хуліганствам гэта можна кваліфікаваць толькі з пункту гледжаньня калянізатара. Такія ўчынкі рэдкія, тым ён і заслужыў да сябе ўвагу. Таму «НН» пра яго часта піша. Іншыя заўвагі ўлічым — тое, што ў нашых сілах.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Жарты. У школе**

Вучыцель: Калі адзін гаспадар выйдзе ў трэцяй гадзіне з дому і будзе ісьці да гораду дзьве гадзіны, а другі выйдзе ў чацьвёртай і будзе ісьці толькі гадзіну, то дзе яны спаткаюцца а пятай?

Вучанік: У карчме, пане вучыцель!

**«Наша Ніва».1911. №31—32.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Мілая, дарагая Наталька!** Я цябе дужа кахаю і спадзяюся, што адзін год не перашкодзіць, а наадварот, умацуе нашыя пачуцьці!!! З Днём народзінаў цябе. Твой Юрка, Горадня

### ГЕНЭРАТАР

**Патрэбны генэратар** для правядзеньня фэстывалю «Аршанская бітва — 2006». Т.: 319-65-74

### ПРАЦА

**Якасны набор, рэдагаваньне тэкстаў** на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя, пасьля 17-й. Т.: 235-18-72, Юрась

**Якасна выканаю пісьмовыя працы** па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17-й. Т.: 235-18-72, Юрась

### ТРАКТАР

**Куплю трактар** МТЗ. Т.: 179-34-67

### ВАЗОНЫ

**Падару** кветкі! Альяс, драцэна. Т.: (8-025) 999-24-33. Слава

### ПРАДАМ

**Ровар** беларускай вытворчасьці МТВ-100 (спартовы), зь люстэркам, помпай, званком, беларускімі налепкамі (герб, сьцяг). Т.: (8-025) 999-24-33

**Рарытэтныя** лыжы часоў Другой сусьветнай вайны. Т.: (8-025) 999-24-33

## А ты падпішыся!



**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**
проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 30.**

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, аднооўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам.галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная 20а-112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 2371. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 23.08.2006.
Замова № 4689.
Рэдакцыйны адрас: вул. Калектарная 20а-112.